ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 79 (2028)
1 кастрычніка 1965 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

28 верасня 1965 года Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС працягваў сваю работу.

Абмяркоўваўся даклад тав. А. М. Касыгіна «Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю, удасканаленні планавання і ўзмацненні эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці».

У спрэчках выступілі тт. В. П. Мжаванадзе — першы сакратар ЦК Кампартыі Грузіі, П. Ф. Ламака—старшыня Дзяржплана СССР, Т. Усубаліеў — першы сакратар ЦК Кампартыі Кіргізіі, А. А. Кокараў — першы сакратар Краснаярскага крайкома КПСС, Б. Е. Бутома — міністр суднабудаўнічай прамысловасці СССР, В. Ю. Ахундаў — першы сакратар ЦК Кампартыі Азербайджана, В. Э. Дымшыц — старшыня Савета народнай гаспадаркі СССР, М. Т. Яфрэмаў — першы сакратар Горкаўскага абкома КПСС, Е. І. Дзегцяроў — першы сакратар Данецкага абкома КП Украіны, С. П. Паўлаў — першы сакратар ЦК ВЛКСМ, З. Н. Нурыеў — першы сакратар Башкірскага абкома КПСС, А. Я. Пельшэ — першы сакратар ЦК Кампартыі Латвіі, К. А. Новікаў—першы сакратар Архангельскага абкома КПСС.

29 верасня 1965 года Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС працягваў работу.

Працягвалася абмеркаванне даклада тав. А. М. Касыгіна «Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю, удасканаленні планавання і ўзмацненні эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці».

У спрэчках выступілі тт. А. Ф. Яштокін — першы сакратар Кемераўскага абкома КПСС, Я. Н. Зарабян — першы сакратар ЦК Кампартыі Арменіі, А. Ю. Снечкус — першы сакратар ЦК Кампартыі Літвы.

На Пленуме з прамовай выступіў Першы сакратар ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнеў.

Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС аднадушна прыняў пастанову «Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю, удасканаленні планавання і ўзмацненні эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці».

З дакладам па другому пытанню парадку дня Пленума аб скліканні чарговага XXIII з'езда КПСС выступіў тав. Л. І. Брэжнеў.

Пленум аднадушна прыняў пастанову па гэтаму пытанню.

Пленум выбраў тав. Ф. Д. Кулакова сакратаром ЦК КПСС.

Пленум вызваліў тав. В. М. Цітова ад абавязкаў сакратара ЦК КПСС у сувязі з пераходам на работу ў ЦК Кампартыі Казахстана.

На гэтым Пленум закончыў сваю работу.

29 сакавіка 1966 года склікаецца чарговы XXIII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

АБ СКЛІКАННІ ЧАРГОВАГА XXIII З'ЕЗДА КПСС

ПАСТАНОВА ПЛЕНУМА ЦК КПСС, ПРЫНЯТАЯ 29 ВЕРАСНЯ 1965 ГОДА

1. Склікаць чарговы XXIII з'езд КПСС 29 сакавіка 1966 года.

2. Зацвердзіць наступны парадак дня з'езда:

1) Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта КПСС — дакладчык Першы сакратар ЦК КПСС тав. Брэжнеў Л. І.

2) Справаздачны даклад Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС — дакладчык старшыня Рэвізійнай камісіі тав. Мураўёва Н. А.

3) Дырэктывы XXIII з'езда КПСС па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1966—1970 гг.—дакладчык Старшыня Савета Міністраў СССР тав. Касыгін А. М.

4) Выбары цэнтральных органаў партыі.

3. Устанавіць наступныя нормы прадстаўніцтва на XXIII з'езд КПСС: адзін дэлегат з рашаючым голасам ад 2,5 тысячы членаў партыі і адзін дэлегат з дарадчым голасам ад 2,5 тысячы кандыдатаў у члены партыі.

4. Дэлегаты на XXIII з'езд КПСС выбіраюцца згодна са Статутам партыі закрытым (тайным) галасаваннем на абласных, краявых партыйных канферэнцыях і з'ездах кампартый саюзных рэспублік. Выбары дэлегатаў на з'езд КПСС ад кампартый Украіны, Беларусі, Узбекістана і Казахстана праводзяцца на абласных партыйных канферэнцыях.

Камуністы, якія знаходзяцца ў партыйных арганізацыях Савецкай Арміі, Ваенна-Марскога Флоту, унутранай і канвойнай варты і пагранічных часцей, выбіраюць дэлегатаў на XXIII з'езд КПСС разам з астатнімі партыйнымі арганізацыямі на абласных, краявых партканферэнцыях або з'ездах кампартый саюзных рэспублік.

Камуністы партыйных арганізацый часцей Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, якія знаходзяцца за мяжой, выбіраюць дэлегатаў на XXIII з'езд партыі на партыйных канферэнцыях адпаведных вайсковых злучэнняў.

АБ ПАЛЯПШЭННІ КІРАВАННЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЮ, УДАСКАНАЛЕННІ ПЛАНАВАННЯ І ЎЗМАЦНЕННІ ЭКАНАМІЧНАГА СТЫМУЛЯВАННЯ ПРАМЫСЛОВАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

ПАСТАНОВА ПЛЕНУМА ЦК КПСС, ПРЫНЯТАЯ 29 ВЕРАСНЯ 1965 ГОДА

Камуністычная партыя Савецкага Саюза, цвёрда і паслядоўна ажыццяўляючы курс на будаўніцтва камуністычнага грамадства ў СССР, пасля кастрычніцкага (1964 год) Пленума ЦК праводзіць вялікую работу па ўдасканаленню метадаў і стылю кіраўніцтва палітычным, грамадскім і эканамічным жыццём краіны. Адноўлены ленінскія арганізацыйныя прынцыпы пабудовы партыйных органаў. У галіне кіраўніцтва народнай гаспадаркай партыя ўсё глыбей уваходзіць у сутнасць эканамічных адносін у нашым грамадстве для таго, каб правільна выкарыстаць яго эканамічныя законы і велізарныя творчыя магчымасці ў інтарэсах народа. На сакавіцкім Пленуме ЦК распрацавана і ажыццяўляецца канкрэтная праграма развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці.

Цяпер у якасці важнейшай задачы ставіцца пытанні далейшага паляпшэння работы прамысловасці. Добра арганізаваная і высакаразвітая прамысловасць з'яўляецца асновай сучаснай сацыялістычнай эканомікі, базай магутнасці краіны. Ад узроўню і маштабаў яе развіцця, ад вынікаў яе работы залежыць паспяховы рост усёй нашай эканомікі, павышэнне дабрабыту савецкага народа, далейшае ўмацаванне абараназдольнасці Савецкага Саюза.

Прамысловасць няспынна расце і ўдасканальваецца. На працягу сямігодкі агульны аб'ём прамысловай вытворчасці павялічваецца прыкладна на 84 працэнты замест 80 працэнтаў па плану, намнога ўзрастае выпрацоўка электраэнергіі, здабыча нафты, газу, вугалю, выплаўка чыгуну і сталі.

Забяспечваецца значны рост выпуску хімічнай прадукцыі, машын, абсталявання, прыбораў, тавараў народнага ўжытку. За сем гадоў пабудавана і ўведзена ў дзеянне больш як 5,5 тысячы буйных прамысловых прадпрыемстваў. Асноўныя вытворчыя фонды ў прамысловасці павялічваюцца амаль у два разы.

З улікам сучасных патрабаванняў істотна змяняецца структура прамысловай вытворчасці. Доля электраэнергетыкі, машынабудавання і хімічнай прамысловасці, гэта значыць галін, якія забяспечваюць тэхнічны прагрэс усёй народнай гаспадаркі, за сем гадоў узрастае з 27 працэнтаў да 35 працэнтаў.

Праведзен рад мерапрыемстваў па павышэнню заработнай платы рабочых і служачых, пенсійнаму забеспячэнню калгаснікаў, паляпшэнню забеспячэння насельніцтва таварамі народнага ўжытку і па далейшаму расшырэнню жыллёвага будаўніцтва.

Гэтыя поспехі — вынік велізарнай творчай працы рабочых, інжынераў, тэхнікаў, вучоных, вялікай арганізатарскай і выхаваўчай работы партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый.

Важныя задачы, якія стаяць перад савецкай эканомікай у галіне павышэння ўзроўню і тэмпаў развіцця прамысловасці, паскарэння тэхнічнага прагрэсу ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і далейшага ўздыму дабрабыту народа, патрабуюць мабілізацыі ўсіх магчымасцей для поўнага выкарыстання наяўных рэзерваў прамысловасці, росту нацыянальнага даходу. Галоўнымі з іх з'яўляюцца павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, рост прадукцыйнасці працы, павелічэнне аддачы капітальных укладанняў і асноўных вытворчых фондаў, ажыццяўленне найстражэйшага рэжыму эканоміі, ліквідацыя празмернасцей і непрадукцыйных расходаў, усямернае развіццё творчай ініцыятывы працоўных у вырашэнні гэтых задач.

Вялікае значэнне набывае ўдасканаленне планавага кіраўніцтва эканомікай, павышэнне навуковага ўзроўню дзяржаўнага планавання. Народнагаспадарчыя планы павінны ўлічваць перспектывы навукова-тэхнічнага прагрэсу, прадугледжваць хуткія тэмпы ўкаранення і асваення найноўшых дасягненняў навукі і тэхнікі, грунтавацца на рэальных і аб'ектыўных разліках. Пры складанні планаў неабходна захоўваць важнейшыя прынцыпы — строгі ўлік эканамічных законаў сацыялізма, забеспячэнне прапарцыянальнасці ў развіцці эканомікі, атрыманне максімуму прамысловай прадукцыі пры найменшых затратах.

Пленум ЦК КПСС адзначае, што існуючая арганізацыйная структура кіравання, метады планавання і эканамічнага стымулявання ў прамысловасці не адпавядаюць сучасным умовам і ўзроўню развіцця прадукцыйных сіл.

Сур'ёзным недахопам у кіраўніцтве прамысловасцю з'яўляецца тое, што ў ім прэваліравалі адміністрацыйныя метады ў шкоду эканамічным. Гаспадарчы разлік на прадпрыемствах мае ў многім фармальны характар; правы прадпрыемстваў у гаспадарчай дзейнасці абмежаваны.

Работа прадпрыемстваў рэгламентуецца вялікай колькасцю планавых паказчыкаў, што абмяжоўвае самастойнасць і ініцыятыву калектываў прадпрыемстваў, зніжае адказнасць за паляпшэнне арганізацыі вытворчасці. Сістэма матэрыяльнага заахвочвання работнікаў прамысловасці слаба зацікаўлівае іх у паляпшэнні агульных вынікаў работы прадпрыемстваў, у павышэнні рэнтабельнасці вытворчасці і паляпшэнні якасці прамысловай прадукцыі.

Кіраванне прамысловасцю па тэрытарыяльнаму прынцыпу, крыху расшырыўшы магчымасці міжгаліновай спецыялізацыі і кааперавання прамысловай вытворчасці ў межах эканамічных раёнаў, у той жа час стрымлівала развіццё галіновай спецыялізацыі і рацыянальных вытворчых сувязей паміж прадпрыемствамі, што знаходзяцца ў розных эканамічных раёнах, аддаліла навуку ад вытворчасці, прывяло да раздробленасці і шматступеньчатасці кіраўніцтва галінамі прамысловасці, да страты аператыўнасці ў рабоце.

З мэтай далейшага развіцця прамысловасці і павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, паскарэння тэхнічнага прагрэсу, павелічэння тэмпаў росту нацыянальнага даходу і забеспячэння на гэтай аснове далейшага ўздыму дабрабыту савецкага народа патрабуецца палепшыць метады планавання, узмацніць эканамічнае стымулыванне прамысловай вытворчасці, павысіць матэрыяльную зацікаўленасць работнікаў у паляпшэнні вынікаў работы прадпрыемстваў.

Пленум ЦК лічыць неабходным арганізаваць кіраванне прамысловасцю па галіновым прынцыпу, утварыць саюзна-рэспубліканскія і агульнасаюзныя міністэрствы па галінах прамысловасці.

Прызнаць мэтазгодным ліквідаваць залішнюю рэгламентацыю дзейнасці прадпрыемстваў, скараціць колькасць планавых паказчыкаў, што зацвярджаюцца прадпрыемствам зверху, надзяліць іх неабходнымі сродкамі для развіцця і ўдасканалення вытворчасці, палепшыць выкарыстанне такіх важнейшых эканамічных рычагоў, як прыбытак, цана, прэмія, крэдыт.

Ад гаспадарчых і планавых органаў патрабуецца вялікая гібкасць і аператыўнасць у планаванні і кіраванні вытворчасцю, умене своечасова ўлічваць гаспадарчую абстаноўку, якая мяняецца, манеўраваць рэсурсамі, увязваць вытворчасць з усталяванымі патрэбамі і попытам насельніцтва, умацоўваць гаспадарчы разлік, хутка ўкараняць навукова-тэхнічныя дасягненні, знаходзіць у канкрэтных умовах прадпрыемства лепшыя спосабы вырашэння гаспадарчых задач.

Уся сістэма планавання, кіраўніцтва вытворчасцю і матэрыяльнага заахвочвання павінна быць накіравана на забеспячэнне высокіх тэмпаў развіцця грамадскай вытворчасці і павышэнне яе эфектыўнасці. Важнейшай умовай дасягнення ўказаных мэт з'яўляецца стварэнне ў калектываў прадпрыемстваў зацікаўленасці ў распрацоўцы больш высокіх планавых заданняў, у паляпшэнні выкарыстання вытворчых фондаў, рабочай сілы, матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў, удасканаленні тэхнікі, арганізацыі працы, павышэнні рэнтабельнасці вытворчасці.

Расшыраючы гаспадарчую самастойнасць прадпрыемстваў, партыя і Савецкі ўрад будуць і ў далейшым праводзіць адзіную палітыку ў галіне планавання галоўных напрамкаў развіцця вытворчасці, тэхнічнага прагрэсу, капітальных укладанняў, цэн, аплаты працы і фінансаў.

Важнае значэнне прапануемых мер па паляпшэнню арганізацыі кіравання і ўзмацненню эканамічных метадаў кіраўніцтва прамысловасцю заключаецца ў тым, што яны спалучаюць адзінае дзяржаўнае планаванне з поўным гаспадарчым разлікам прадпрыемстваў, цэнтралізаванае галіновае кіраванне з шырокай рэспубліканскай і мясцовай гаспадарчай ініцыятывай, прынцып адзіначаллля з павышэннем ролі вытворчых калектываў. Пры гэтым забяспечваецца далейшае расшырэнне дэмакратычных прынцыпаў кіравання, стварэнне эканамічных перадумоў для больш шырокага ўдзелу мас у кіраванні вытворчасцю і іх уздзеяння на вынікі эканамічнай работы прадпрыемстваў. Такая сістэма гаспадарчага кіравання больш поўна адпавядае сучасным патрабаванням і дасць магчымасць лепш выкарыстаць перавагі сацыялістычнага ладу.

Пленум адабрае распрацаваныя Прэзідыумам ЦК КПСС і амешчаныя ў дакладзе члена Прэзідыума ЦК КПСС, Старшыні Савета Міністраў СССР тав. Касыгіна А. М. мерапрыемствы па паляпшэнню кіравання прамысловасцю, удасканаленню планавання і ўзмацненню эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці і даручае Прэзідыуму ЦК КПСС і Савету Міністраў СССР прыняць рашэнні па гэтых пытаннях і ўнесці на разгляд Вярхоўнага Савета СССР прапановы аб органах кіравання прамысловасцю.

Пленум даручае Прэзідыуму ЦК КПСС, Савету Міністраў СССР, ЦК кампартый саюзных рэспублік, крайкомам і абкомам партыі за кароткі тэрмін вырашыць усе арганізацыйныя пытанні, звязаныя з утварэннем саюзна-рэспубліканскіх і саюзных міністэрстваў, а таксама органаў гаспадарчага кіраўніцтва на месцах з тым, каб забяспечыць нармальную работу прамысловасці, правільна вырашыць пытанні выкарыстання і расстаноўкі кадраў скасоўваемых гаспадарчых арганізацый, умацаваць высококваліфікаванымі кадрамі прадпрыемствы. Укамплектаваць новаствараемыя міністэрствы і ведамствы высококваліфікаванымі спецыялістамі, добрымі арганізатарамі, здольнымі па-дзяржаўнаму весці справу.

Лічыць галоўнай задачай міністэрстваў, калектываў прамысловых прадпрыемстваў, навукова-даследчых, канструктарскіх і праектных арганізацый забеспячэнне высокіх тэмпаў развіцця і павышэння эфектыўнасці прамысловай вытворчасці, усямерны рост прадукцыйнасці працы, найлепшае выкарыстанне наяўных вытворчых фондаў. З гэтай мэтай забяспечыць на спрэве шырокае ўкараненне ў народную гаспадарку найноўшых дасягненняў айчыннай і замежнай навукі і тэхнікі, навуковай арганізацыі працы, паляпшэнне якасці прадукцыі, умацаванне дзяржаўнай і вытворчай дысцыпліны, павышэнне адказнасці кожнага работніка за даручаную яму справу.

Пленум ЦК падкрэслівае, што міністэрствы нясуць перад партыяй, дзяржавай і савецкім народам адказнасць за паспяховае развіццё прамысловасці, яе высокі тэхнічны ўзровень, за забеспячэнне ўсіх галін народнай гаспадаркі тэхнічна дасканалымі і высокапрадукцыйнымі машынамі, абсталяваннем і прыборамі, высакаякаснай сыравінай і матэрыяламі, за больш поўнае задавальненне патрэб насельніцтва ў добрых таварах народнага ўжытку.

Пераход да галіновага прынцыпу кіраўніцтва прамысловасцю і ўзмацненне эканамічных рычагоў у развіцці вытворчасці яшчэ вышэй узнімаюць ролю партыйных арганізацый рэспублік, краёў, абласцей, гарадоў, раёнаў, прадпрыемстваў, міністэрстваў і ведамстваў у барацьбе за забеспячэнне высокіх тэмпаў развіцця эканомікі, павышаюць іх адказнасць за работу прадпрыемстваў і гаспадарчых органаў па выкананню народнагаспадарчых планаў і дзяржаўных заданняў. Партыйныя камітэты, не падмяняючы гаспадарчых кіраўнікоў, абавязаны сканцэнтраваць галоўную ўвагу на арганізатарскай рабоце, падборы, расстаноўцы і выхаванні кадраў, на кантролі за выкананнем дырэктыў партыі і ўрада, на ўзмацненні камуністычнага выхавання працоўных.

Партыйныя арганізацыі абавязаны пастаянна вывучаць дзейнасць прадпрыемстваў і дапамагаць гаспадарчым кіраўнікам выяўляць і ліквідоўваць недахопы, накіроўваць намаганні працоўных на вышуканне і прывядзенне ў дзеянне ўсіх рэзерваў вытворчасці, рашуча змагацца з праяўленнямі як ведамасных, так і месніцкіх тэндэнцый.

Партыйныя камітэты павінны глыбока, з веданнем справы разбірацца ў эканоміцы вытворчасці, арганізаваць рашучую барацьбу за беражлівасць і эканомію грашовых сродкаў, матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, зрабіць яе сапраўды ўсенароднай справай, узбройваць кадры эканамічнымі ведамі, вучыць іх уменню правільна выкарыстоўваць эканамічныя рычагі для паляпшэння прамысловай вытворчасці.

Партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі абавязаны ўзмацніць работу па павышэнню камуністычнай свядомасці працоўных, развіваць іх творчую актыўнасць, настойліва змагацца за павышэнне прадукцыйнасці працы, умацаванне працоўнай і вытворчай дысцыпліны, больш праяўляць клопатаў аб паляпшэнні ўмоў працы і быту рабочых і служачых. Неабходна палепшыць арганізацыю сацыялістычнага спаборніцтва працоўных з тым, каб усё перадавое, што нараджаецца на вытворчасці, набывала масавае распаўсюджанне і ўкараненне. Трэба максімальна выкарыстоўваць магчымасці новай сістэмы гаспадарання для далейшага ўздыму вытворчасці і матэрыяльнага заахвочвання прадпрыемстваў і работнікаў прамысловасці, якія добра працуюць.

Эканамічныя стымулы павышэння прадукцыйнасці грамадскай працы — гэта магутны сродак руху сацыялістычнай эканомікі да камунізма. У той жа час партыя і ў далейшым будзе няўхільна праводзіць курс на павышэнне камуністычнай свядомасці працоўных, на выхаванне камуністычных адносін да працы. Толькі пры свядомым, ініцыятыўным і творчым падыходзе кожнага працаўніка да сваёй справы, пры беражлівых, гаспадарчых адносінах кожнага да народнага здабытку можна змагацца за пабудову камуністычнага грамадства. Абавязак партыйных арганізацый — усямерна развіваць маральныя стымулы да працы, ствараць усе ўмовы для росквіту сапраўды камуністычнай творчасці мас.

Пленум абавязвае партыйныя арганізацыі шырока растлумачыць работнікам прамысловасці, усім працоўным сутнасць рашэнняў гэтага Пленума, сканцэнтраваць усе сілы партыйных, савецкіх і гаспадарчых кадраў на выкананні распрацаваных партыяй і ўрадам мерапрыемстваў. Выпрацоўваючы гэтыя меры, наша партыя зыходзіла з карэнных інтарэсаў рабочага класа, усіх працоўных нашай краіны, усебакова ўлічвала прапановы і пажаданні рабочых, работніц, інжынераў і тэхнікаў, вучоных, партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый.

□ □

Пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза выказвае ўпэўненасць у тым, што меры па паляпшэнню кіравання прамысловасцю, удасканаленню планавання і ўзмацненню эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці будуць з задавальненнем сустрэты партыяй і ўсімі працоўнымі нашай краіны. Паспяховае ажыццяўленне гэтых мер яшчэ вышэй узніме эканамічную магутнасць Савецкай дзяржавы, забяспечыць далейшы рост народнага дабрабыту, яшчэ больш умацуе саюз рабочых і сялян, будзе садзейнічаць больш паспяховаму вырашэнню задач камуністычнага будаўніцтва.

Трактары маркі «Беларусь» з ахвотай набываюць многія краіны свету. Гэтыя прыгажуны, што відны на здымку, будуць працаваць на палях Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам. Фота І. ЗМІТРОВІЧА. (БЕЛТА).

ДЭКАДА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў БАЛГАРЫІ

ПАЧУЦЦЁ СЯМ'І АДЗІНАЙ

Трэба прысутнічаць на балгара-беларускіх сустрэчах, што адбываюцца цяпер у нашай краіне, каб адчуць выключную сілу дружбы двух народаў. Узаемная любоў і вернасць, змацаваныя братэрствам крыві і мовы, агульнай барацьбой за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне, вытрымлівалі і вытрымаюць самыя цяжкія выпрабаванні. На шляху да камунізма, у дружбе з усімі савецкімі, у тым ліку беларускім, народамі, мы, балгары, бачым свой лёс, сваю будучыню.

Маршрут дэлегацыі, якая прыехала ў Балгарыю з Беларусі ў сувязі з Дэкадай беларускай культуры, — а гэты маршрут па ўсіх напрамках перасякае нашу зямлю—усюды сутыкаецца са шчырай радасцю, з сардэчным хваляваннем. У кожным горадзе, у кожнай вёсцы дэлегацыю сустракаюць горача і ўрачыста. Дарога яе ад Сафіі да горада Кюстэндзіла ператварылася ва ўрачыстае шэсце. Шпалеры людзей з кветкамі і радаснымі воклічамі віталі пасланцоў беларускага народа абапал дарогі. На сходы, прысвечаныя Дэкадзе, на канцэрты беларускіх артыстаў прыходзяць тысячы і тысячы людзей.

Балгарскі друк надзвычай высока ацэньвае выступленні майстроў мастацтва Беларусі. Газета «Работнічэска дзела», гаворачы пра канцэрт, які адбыўся ў горадзе Плеўне, адзначае «высокае майстэрства оперных спевакоў Нінель Ткачэнка — народнай артысткі СССР і Анатоля Генерапава—народнага артыста БССР, эстрадных артыстаў Эдуарда Міцуль і Сцяпана Машынскага, салістаў балета Ніны Давыдзенка і Валянціна Давыдава —народных артыстаў БССР, выканаўцаў на народных інструментах і інш.».

У рэцэнзіі на канцэрт беларускіх артыстаў у Сафіі газета «Народна култура» піша: «У гэтым канцэрце выступалі оперныя спевакі Васіль Кірычэнка і Станіслава Гулевіч. Яны выконвалі толькі эстрадныя і народныя песні, але іх выкананне не парушала агульнага стылю эстраднай праграмы, у якой прымалі ўдзел эстрадныя спевакі і ансамблі. Гэта паказвае, што ў Савецкім Саюзе (як і ў іншых краінах) добрыя оперныя спевакі могуць выконваць эстрадны рэпертуар, спалучаючы майстэрства кваліфікаваных спевакоў з яркай артыстычнасцю. У гэтых адносінах асабліва спадабаўся публіцы тэнар Кірычэнка, які выканаў балгарскую эстрадную песню «Сафійская восень»... Глыбокае ўражанне пакінула выступленне Нінель Ткачэнка, якая ў арыі Эболі з оперы «Дон Карлас» і асабліва ў арыёза Маці з кантаты «Нам патрэбен мір» Новікава паказала выдатны драматызм і тонкую музычную выразнасць. Высокую тэхніку прадэманстравалі ў сваіх нумарах Віктар Ржэвускі і Фёдар Чарапанаў. З вялікай грацыёзнасцю былі выкананы ўрыўкі з балета «Лебядзінае возера» і з «Вальпургіевай ночы» Нінай Давыдзенка і Валянцінам Давыдавым. Шчыра і непасрэдна спяваў барытон Міхаіл Дружына».

У газетах апублікавана шмат артыкулаў пра беларускую культуру, а таксама вершы і апавяданні беларускіх пісьменнікаў. Апублікаваны гутаркі з членамі дэлегацыі дзеячоў беларускай культуры В. Смірновым, М. Пахомавым, І. Шамякіным.

Радаснае ўражанне выклікала адкрыццё ў Сафіі выстаўкі беларускай кнігі. Паводле слоў газеты «Земледзелско знаме», выстаўка дэманструе «высокае развіццё культуры, якая вырасла пад сонцам сацыялізма. Балгарскі чытач знаёміцца з літаратурай, вельмі блізкай яму па свайму духу і ідэях».

Дэкада беларускай культуры праходзіць з вялікім поспехам. Па ўсёй краіне яна выклікае пачуцці глыбокай любві да Савецкага Саюза, да братняга беларускага народа, пачуцці дружбы і адзінства.

Спас ГЕРГАЎ,
намеснік галоўнага рэдактара газеты «Народна култура».

Сафія
(па тэлефоне).

АРХІТЭКТУРА

ЯКІ ЁН, ГАНДЛЁВЫ ІНТЭР'ЕР?

Калі перабіраеш у памяці ўражанні аб незнаёмым горадзе, які ўпершыню давялося наведаць, абавязкова ўспомніш не толькі пра музеі і тэатры, старажытныя помнікі і новыя жылыя кварталы, але і пра магазіны, кіёскі, кафэ. Напэўна, таму, хто бываў у суседнім Вільнюсе, разам з цікава вырашанымі грамадскімі будынкамі і жылымі раёнамі, запомніліся з густам афармленыя кафэ «Нерынга», «Таўрас», рэстаран «Дайнава».

Інтэр'ер магазіна ці памяшкання грамадскага харчавання—самы дэмакратычны, даступны, масавы. Аднак ёсць у ім і яшчэ адна асаблівасць: у выніку свайго функцыянальнага прызначэння ён набывае нейкія рысы інтымнасці, камернасці. Адсюль і своеасаблівасць падыходу да архітэктурнага вырашэння інтэр'ераў гэтага роду.

Яшчэ зусім нядаўна наглядалася механічнае перанясенне ў гандлёвыя інтэр'еры форм і прыёмаў, характэрных для вялікіх грамадскіх будынкаў, нават экстэр'ераў. (Я ўжо не кажу пра тое, што, як правіла, гэта былі эклектычныя кампіляцыі на тэму італьянскага Рэнесансу). Гэтыя інтэр'еры можна бачыць і сёння. Зайдзіце ў Мінскі дзяржаўны універмаг, наведайце некаторыя іншыя магазіны па Ленінскім праспекце, кафэ «Вясна», рэстаран «Радуга». Што характэрна для гэтых інтэр'ераў? Імкненне стварыць уражанне нечага параднага, пампезнага. Адсюль—нагрувашчванне дэталей, цяжкае абсталяванне. Тут няма галоўнага—інтымнасці, суразмернасці, увагі да чалавека.

Нельга сказаць, што зараз у новых інтэр'ерах усё бездакорна. Але многае змянілася ў лепшы бок. З'явіліся такія выдатна вырашаныя будынкі, як дом гарвыканкома і жылыя дамы на плошчы імя Калініна (арх. Г. Сысоеў, С. Мусінскі), новы будынак Мінскага інстытута замежных моў (арх. Н. Шпігельман, Ю. Грыгор'ёў), галоўны корпус гадзінікавага завода (арх. С. Баткоўскі, Н. Шпігельман) і іншыя. Паявіліся і новыя гандлёвыя памяшканні, у інтэр'еры якіх адчуваецца правільнае разуменне новых патрабаванняў.

Вось адзін з першых праектаў у новым плане—кафэ «Бярозка» на плошчы Перамогі (арх. Л. Мельнік). Яно займае старое памяшканне з дрэннымі прапорцыямі і непамерна высокай столлю. Але сёння нічога гэтага вы не адчуваеце. Гронкі зграбных свяцільнікаў на доўгіх шнурах скрадваюць вышыню, драўляныя лакіраваныя рашоткі з кветкамі расчляняюць залу на асобныя «секцыі», стваракоўць некаторую інтымнасць. Лаканічна і лёгка вырашаны буфетныя стойкі, і, як завяршаючы акорд, зроблена асіметрычнай формы ніша-вітрына. Зразумела, не ўсё ў кафэ вырашана добра. Але аўтар праекта дамогся галоўнага—спалучэння грамадскага і інтымнага ў сучасных і простых формах.

З апошніх удалых работ можна назваць інтэр'ер магазіна «Сантэхнічнае абсталяванне» па вуліцы Ульянаўскай (арх. Р. Бекельман). Памяшканне было невялікае, вельмі непрыгожае і, як здавалася спачатку, у архітэктурным сэнсе безнадзейнае. Цяпер інтэр'ер магазіна вырашаны па-сучаснаму. Тут стрыманая каляровая гама ў апрацоўцы калон і сцен. Калоны аблiцаваны сінтэтычнай пліткай. На фоне яе добра чытаецца лёгкае, зграбнае гандлёвае абсталяванне з прыгожа знойдзеным падсветам. Трапна вырашаны і добра выкананы казырок з уманціраванымі ў яго свяцільнікамі. І, нарэшце, апошні, завяршаючы мазок—у тарны гандлёвай залы зроблены макет кухні і санітарнага вузла з дэкаратыўнай мазаікай, выкананай з тых жа паліхлорвінілавых рознакаляровых плітак (мастак Л. Эрлер).

З лепшых гандлёвых інтэр'ераў, пабудаваных за апошнія гады ў Мінску, можна адзначыць, вядома, з нейкімі агаворкамі, «Дом абутку», магазіны «1000 дробязей», тытунёвы па праспекце імя Леніна, «Бярозка», «Спорт», некаторыя магазіны ў Гродна і Віцебску. Аўтары праектаў імкнуцца да маштабнасці, увязкі эстэтычнага пачатку з функцыянальным.

На жаль, многія магазіны і прадпрыемствы грамадскага харчавання ў нашай рэспубліцы яшчэ не маюць свайго аблічча, яны падобныя адзін да аднаго. Чаму так здараецца?

У нас ёсць таленавітыя архітэктары і мастакі, ёсць новыя аддзелачныя матэрыялы (праўда, у невялікай колькасці)—можна тварыць, спрабаваць. Аднак па-сапраўднаму вырашэннем гандлёвага інтэр'ера ніхто да гэтага часу не займаўся. Пасля таго, як у Мінску быў ліквідаваны філіял праектнага інстытута «Союзгіпроторг», праекты гандлёвых памяшканняў пачалі рабіць усе праектныя ўстановы, якія толькі ёсць у рэспубліцы, і якія часам да гандлю не маюць ніякіх адносін. Яны займаліся гэтай работай, як нечым другарадным, не ведаючы спецыфічных асаблівасцей інтэр'ераў магазінаў, рэстаранаў, кафэ, не ўлічваючы складаны комплекс тэхналагічных, спецыфічна-канструктыўных і дэкаратыўных момантаў, не клапоцячыся пра рэкламу і светатэхніку, пра зручнасці для пакупнікоў і працаўнікоў прылаўка. Некаторыя кіраўнікі архітэктурных устаноў і сёння прачягваюць вырашаць гандлёвыя інтэр'еры, не маючы для гэтага ні адпаведных спецыялістаў, ні магчымасцей.

Вось чаму ў нас па-ранейшаму з'яўляюцца няўдалыя гандлёвыя памяшканні.

І вельмі добра, што нядаўна Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў СССР па гандлі і Дзяржбуд СССР прынялі своечасовае рашэнне зб адкрыцці ў Мінску Беларускага дзяржаўнага інстытута па праектаванні прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання. Інстытут створаны на базе вопытна-канструктарскага бюро «Белгандальмантаж» Міністэрства гандлю БССР, невялікай праектнай арганізацыі, архітэктары якой вырашылі рад інтэр'ераў, што атрымалі высокую ацэнку грамадскасці. Новы інстытут аб'яднае творчыя архітэктурныя сілы нашай рэспублікі, узніме на высокі ўзровень праектаванне гандлёвых інтэр'ераў.

Але тут узнікае рад іншых, яшчэ нявырашаных сур'ёзных праблем. У тым, што многія нашы гандлёвыя інтэр'еры невысокія па сваіх эстэтычных якасцях, вінаваты не толькі архітэктары. Часам бывае так, што праект быў добры, а вось ажыццёўлены ён так неахайна, з такімі адхіленнямі, што яго не можа пазнаць сам аўтар. Чаму бываюць такія адхіленні ад праектаў, усім архітэктарам добра вядома.

Справа ў тым, што іншы раз заказчыку, дырэктару магазіна, рэстарана, асабіста не падабаецца сучасная асвятляльная арматура. Ён, бачыце, любіць дапатопныя люстры «пад бронзу». Або, напрыклад, прараб «вынайшаў», што пакласці алейную фарбу прасцей і танней, чым рабіць аблiцоўку шпонам ці пласцікам. Здараецца і так, што ў дадзены момант няма пад рукой патрэбнага матэрыялу — а шукаць яго ніхто не хоча. І, не параіўшыся з аўтарам праекта, не паглядзеўшы ў чарцёж, не спытаўшы дазволу ў праектнай арганізацыі, будаўнікі і заказчыкі так усё «размалююць», што аж глядзець брыдка. Яны замяняюць матэрыялы, абсталяванне і нават тэхналогію. А ў праектнай установы, у аўтараў праекта няма ніякіх правоў, каб спыніць такі здзек. Яны пішуць толькі скаргі ў розныя інстанцыі. І зрэдку атрымоўваюць на іх адказы, звычайна... пасля заканчэння будаўніцтва.

Калі, нарэшце, аўтар праекта (архітэктар або праектная арганізацыя) атрымаюць аўтарскія правы? Чаму наборшчык, лінатыпіст, ніколі нават і не падумае змяніць тэкст у кнізе ці часопісе, а будаўнік мяняе праект, як ён хоча? Трэба, нарэшце, завесці такі парадак, каб аўтар праекта ў пэўных выпадках меў права закрыць фінансаванне будоўлі і тым самым мог папярэдзіць з'яўленне «эстэтычнага браку».

Аўтарскі нагляд пры вырашэнні інтэр'ераў мае асабліва важнае значэнне. У чарцяжах прадугледзець усё нельга. Цэлы рад элементаў арганізацыі прасторы, асвятленне, спалучэнне аддзелачных матэрыялаў можна вырашыць толькі ў натуры, эксперыментальным шляхам. І таму архітэктар павінен увесь час быць на будоўлі і непасрэдна кіраваць работамі.

Другая наша прэтэнзія — да прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. Дзе яны, разрэкламаваныя, даўно абяцаныя новыя аддзелачныя матэрыялы? Дзе дабраякасныя аблiцовачныя пліткі, сінтэтычныя фарбы, дзе слаісты пластык для гандлёвага абсталявання, дзе вялікапамернае вітрыннае і гартаванае шкло? Адзіны новы матэрыял, які асвоены ў рэспубліцы — бабруйскі лінолеум, — мае настолькі непрыгожы знешні выгляд і такія дрэнныя эксплуатацыйныя якасці, што архітэктары стараюцца яго не скарыстоўваць. Часта нас папракаюць, што мы злоўжываем скарыстаннем дрэва — але ж сёння гэта практычна адзіны, даступны аблiцовачны матэрыял.

Цяпер што датычыцца мэблі. Беларуская мэблевая прамысловасць працягвае ўпарта штампаваць раней асвоеныя, застарэлыя, часта антымастацкія вырабы. Мэблевыя фабрыкі рэспублікі не прыслухоўваюцца да голасу архітэктараў і мастакоў. І таму нашы праекціроўшчыкі пры ажыццяўленні адказных аб'ектаў выкарыстоўваюць імпартную мэблю. Гэтага, зразумела, нельга рабіць у масавых інтэр'ерах, даводзіцца браць тое, што даюць. Інтэр'еры атрымоўваюцца рознастылявыя, невыразныя.

Тое ж самае можна сказаць і пра сучасную асвятляльную арматуру. Выбар яе вельмі нязначны. І архітэктары часам праектуюць свяцільнікі самі, імкнуцца наладзіць іх выраб саматужна. Пэўнай тэхнікі, зразумела, няма, і вырабы атрымоўваюцца не заўсёды выдатнай якасці. У якойсьці меры можна было б пераняць прыклад кіяўлян, якія стварылі спецыяльныя эксперыментальныя майстэрні, што вырабляюць для пэўных інтэр'ераў свяцільнікі, дзверныя ручкі і іншую фарнітуру.

У адносінах да грамадскага і гандлёвага інтэр'ера ўзнікае важнае пытанне сінтэзу мастацтваў. Пра тое, што ён патрэбен, проста неабходны—гавораць і пішуць вельмі многа. Але як такі сінтэз ажыццявіць на практыцы, не прапануе ніхто. Архітэктары, канструктары, сантэхнікі працуюць у праектных арганізацыях, атрымоўваюць зарплату і робяць праекты. А мастакоў нам даводзіцца наймаць. Адносіны з мастацкім фондам Саюза мастакоў БССР часта больш камерцыйныя, чым творчыя. А потым паспрабуйце даказаць заказчыку (а гандлёвыя работнікі грошы лічыць добра ўмеюць), што ён павінен плаціць 40 працэнтаў нацэнкі за мастацкія работы. Ніхто не хоча мець такі дарагі «сінтэз»! Мне здаецца, што мы няправільна робім, адчосячы ўсе выдаткі на творы дэкаратыўнага і манументальнага мастацтва за кошт будаўніцтва. Урад рэспублікі адпускае вялікія сродкі на набыццё твораў беларускіх мастакоў і скульптараў. Аднак купляюць звычайна толькі творы станковага жывапісу, графіку, скульптуру. А хіба ж дэкаратыўна-манументальнае мастацтва — ніжэйшага гатунку? Фрэска ці мазаіка, зробленая на сцяне грамадскага будынка, у якім бываюць сотні, а то і тысячы людзей, мае вялікае эстэтычнае значэнне, аказвае ўплыў на фармаванне густу і светапогляду чалавека больш дзейсна, чым дзесяткі станковых карцін у музеі.

Чаму б аб гэтым не падумаць кіраўніцтву Саюза мастакоў?

На мой погляд, многія надзённыя пытанні, пра якія тут гаварылася, можна будзе паспяхова вырашыць толькі тады, калі новы інстытут па праектаванні інтэр'ераў набудзе пэўную арганізацыйную структуру. Ён павінен быць комплексны. Неабходна, каб інстытут меў майстэрні, якія б маглі выраблiць не толькі эксперыментальныя ўзоры абсталявання, але і кераміку, і матэрыял для мазаікі, і дэкаратыўны метал, і шрыфты для патрэб новых інтэр'ераў. У такім інстытуце акрамя архітэктараў, канструктараў, павінны працаваць таксама мастакі, якія прымалі б удзел не толькі ў праектаванні памяшканняў, але і выконвалі б работы ў натуры. Неабходна таксама шырока ўкараніць праектаванне на макетах — і інтэр'ераў цалкам, і яго асобных элементаў: абсталявання, канструкцый.

Сёння гэта толькі мара. Але яна павінна стаць рэальнасцю.

В. АЛАДАЎ,
архітэктар.

Яшчэ нядаўна Галіна Радчанка была вучаніцай у Слуцкім кінатэатры «Беларусь». Тут дзяўчына атрымала неабходныя веды і стала памочнікам кінамеханіка. Працуе намсамолка добра, любіць сваю прафесію.

На здымку, які зрабіў наш няштатны фотакарэспандэнт М. Рубінштэйн, Галіна Радчанка падрыхтоўвае апаратуру да чарговага кінасеанса.

СВЯТОЧНАЯ ЭСТАФЕТА

Парадак дня нарады работн[illegible]каў культуры Добрушскага р[illegible]на — падрыхтоўка культасв[illegible] устаноў да 50-годдзя Савецк[illegible] улады. Раённы аддзел культуры распрацаваў мерапрыемствы па ўздыму культуры к[illegible]гасных вёсак. Яны аднадушн[illegible] ўхвалены ўдзельнікамі нарад[illegible]. Пачала свой шлях па раёну с[illegible]точная эстафета «Людзі, падк[illegible] час».

□ □ □

Карчэўская, Вяляцінская, Стрлічаўская, Хвоенская бібліят[illegible] Хойніцкага раёна закончылі зб[illegible] матэрыялаў па гісторыі сваіх в[illegible]сак.

У гэтай рабоце прынялі актыўн[illegible] ўдзел культработнікі і калгасні[illegible] настаўнікі мясцовых школ і ву[illegible]ні.

На нарадзе ў раённай бібліят[illegible]цы падведзены першыя вынікі [illegible] намечаны задачы на будуч[illegible]. Удзельнікі нарады пазнаёміліся з альбомам «Наша вёска раней і цяпер», плакатам «Любі і вывуч[illegible] свой край».

З нашай пошты

З БОКУ ВІДНЕЙ

Нядаўна ў вашай газеце я прачытаў артыкул «Восем кіламетраў заўваг і прапаноў» і захацеў падзяліцца сваімі думкамі адносна яго. Могуць сказаць, што мне, жыхару вёскі, да таго, як выглядае галоўная вуліца Мінска? Але ў Мінск я часам прыязджаю ў госці да сваякоў, захапляюся прыгажосцю галоўнай магістралі, і хачу, каб яна была яшчэ прыгажэйшая, каб часам не псавалі настрою розныя дробязі.

Мне, напрыклад, непрыемна, што некаторыя надпісы на вуліцах, шыльды непісьменныя. На тралейбусах 5 і 8-х маршрутаў напісана, што яны едуць да плошчы «Я. Колоса», хоць прозвішча нашага паважанага пісьменніка не павінна змяняцца пры перакладзе на рускую мову.

На нашым праспекце мала магазінаў з добрай назвай, ад якой пацяплела б сэрца.

«Чаравічкі» «Паўлінка», «Лакомка» (відаць, лепш было б напісаць «Ласунка»). І часам можна падумаць, што ў нас мала добрых, прыгожых слоў. Ёсць, напрыклад, кафэ «Бярозка» на плошчы Перамогі, дык не ж, адкрываецца яшчэ нейкі магазін з такой жа назвай каля паштамта!

У Мінску, мне здаецца, мала дбаюць пра пасажыра, які не надта добра ведае горад. У іншых гарадах можна купіць карту з усімі транспартнымі маршрутамі, а ў Мінску такой няма. На людных прыпынках на праспекце варта было б вывесіць таблічкі са схемамі, якія паведамлялі б пра рух тралейбусаў, трамваяў, аўтобусаў па гораздзе. Правільна прапануюць аўтары артыкула паставіць на прыпынках лавачкі, каб стомленым ды і старым людзям можна было адпачыць, чакаючы аўтобус. Трэба зрабіць на праспекце больш розных указальнікаў: вось сюды ісці ў музей, сюды—у тэатр, а сюды, скажам,—на Камароўскі рынак. Тады прыезджыя не так блудзілі б.

Можа гэта ўсё і дробязі, але з боку яны кідаюцца ў вочы.

Альбін ШАКЕЛЬ,
калгаснік калгаса імя Мічурына Астравецкага раёна.

ЭКСПАНАТЫ РАДАСЦІ

У Гомелі шмат аматараў прыроды. Адны з іх росцяць кветкі, другія гадуюць птушак, трэція калекцыніруюць у акварыумах рыбак.

Гарадское аддзяленне Таварыства аховы прыроды нядаўна наладзіла ў памяшканні Палаца культуры чыгуначнікаў выстаўку «Хатнія прыроды». Побач з асобнымі аматарамі пра сваю дружбу з прыродай расказалі шматлікія вытв[illegible]чыя калектывы горада.

Кветкаводы такіх прадпрыемстваў, як «Гомсельмаш», шклозавод імя Ламаносава, завод будзіт[illegible]лей, вырашылі, напрыклад, ператварыць свае прад[illegible]прыемствы ў заводы-сады. Сапраўднае мора кв[illegible]так — больш 250 тысяч, а таксама тысячы дэк[illegible]ратыўных і пладовых дрэў пасадзілі на тэрыторыі завода і ў сваім рабочым пасёлку камбайнабуд[illegible]нікі.

Вельмі спадабалася ўсім наведвальнікам выстаўкі невялічкае кветкавае пано «Свету — мір». Гэтая мініяцюра — толькі копія вялікага маляўн[illegible]чага пано, якое стварыў на двары завода буд[illegible]талей вядомы гомельскі аматар кветак Рыгор Абрамавіч Рыўкін. Любімай справай кветкавод зай[illegible]маецца ўжо дваццаць гадоў.

Сваю яркую прадукцыю паказалі на выстаўцы многія кветкаводы. Сабраная ў фае, яна чаравала кожнага, хто прыходзіў сюды, сваім багаццем колераў і водару.

А да гэтай маўклівай прыгажосці так пасавала на выстаўцы нямоўчнае птушынае шматгалоссе. Некаторыя аматары, напрыклад, токар вагонарэмонтнага завода Міхаіл Малашанка, паказалі сем'і птушак з нашых лясоў, іншыя ж прынесці сюды клеткі з прадстаўнікамі «заморскай экзотыкі» — канарэйкамі, папугаямі.

Наведвальніці падоўгу стаялі ля акварыума. Пра сваю багатую калекцыю рыбак, прынесеную на выстаўку, цікава расказваў слесар завода «Гомелькабель» Міхаіл Міцкевіч.

Выстаўка прынесла людзям радасць. Але, на жаль, не ўсе гамяльчане здолелі паглядзець яе—адкрыта яна была ўсяго некалькі дзён. Кіраўніцтва Палаца культуры чыгуначнікаў чамусьці не дазволіла арганізатарам выстаўкі трымаць яе даўжэй у памяшканні.

Думаецца, што такія выстаўкі павінны стаць калі не пастаяннымі, дык традыцыйнымі. Карысць тут відавочная: яны павялічваюць атрад аматараў прыроды.

Ф. КУРАС.

СЯБРЫ ПРЫГАЖОСЦІ

У адным з мастацкіх музеяў ля вядомай карціны спынілася група людзей. Карціна глыбока хвалявала іх і кожнаму хацелася як мага больш даведацца пра яе. Але экскурсавод затрымаўся з наведвальнікамі ў суседняй зале і не мог ім памагчы.

І тады наперад выйшаў хлапчук у форме навучэнца працоўных рэзерваў. Проста і цікава расказаў ён пра гісторыю карціны і яе вартасці, пра мастацкую задуму і пошукі аўтара. Адчувалася, што ён ведае і разумее мастацтва. Здзівіла, адкуль гэта ў такога маладога хлапчука.

І вось я ў Гродзенскім прафесіянальна-тэхнічным вучылішчы № 7, навучэнцам якога назваўся гэты сціплы добраахвотны экскурсавод.

Установа рыхтуе электраманцёраў для сельскай электрыфікацыі, слесараў-мантажнікаў і манцёраў сувязі. Падлеткі выходзяць адсюль кваліфікаванымі спецыялістамі.

Разам з тым установа, расказалі мне, дае выпускнікам шырокія эстэтычныя веды. Для гэтага тут створаны неабходныя ўмовы.

І сапраўды, побач з майстэрняй, рознымі кабінетамі размясціўся пакой з шыльдай «Кабінет эстэтыкі». Зойдзем сюды.

Тут — нібы ў мастацкім музеі. Здзіўляе мноства рэпрадукцый.

— Наша «малая Трацяякоўка», — тлумачыць выкладчык эстэтыкі Сяргей Талочка.

Ён расказвае, што вучылішча шырока знаёміць навучэнцаў з выяўленчым мастацтвам, музыкай і літаратурай. Да паслуг юнакоў і дзяўчат кінапраектар, магнітафон, прайгравальнік, піяніна, фільмаскоп і вузкаплёначны кінаапарат. Моладзь часта наладжвае вечары мастацтва і літаратуры, дыспуты, якія пашыраюць яе эстэтычныя веды, развіваюць добры густ. Эстэтычнаму выхаванню садзейнічае і масавая мастацкая самадзейнасць.

Навучэнцы знаёмяцца таксама з асновамі вытворчай эстэтыкі.

...Я не знайшоў у вучылішчы свайго добраахвотнага экскурсавода. Але ўпэўнены, што такім можа быць кожны выпускнік вучылішча — высокакультурны, адукаваны спецыяліст.

А. ЗГЕЕУ,
апаратчык азотнатукавага завода.
г. Гродна.

ПАТРЭБЕН МАГАЗІН «АСВЕТА»

У Мінску ёсць некалькі спецыялізаваных кніжных магазінаў.

Напрыклад, спатрэбіцца чалавеку якое-небудзь выданне па той ці іншай галіне навукі, ён ідзе ў магазін навукова-тэхнічнай літаратуры. Кніжкі з краін народнай дэмакратыі пакупнік заўсёды знаходзіць у магазіне «Дружба», паэтычны зборнікі—у кіёску «Паэзія».

А вось студэнту, каб знайсці неабходную для вучобы літаратуру, патрэбна пабываць у многіх кнігарнях горада. Тое ж самае можна сказаць і пра вучняў і настаўнікаў школ, і пра выкладчыкаў вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў. Адзелы «Асвета», якія ёсць у кнігарнях, яшчэ не маюць многіх патрэбных выданняў.

Беларускай сталіцы, дзе працуюць дзесяткі ВНУ і тэхнікумаў, больш сотні вучылішч і школ, час ужо мець спецыялізаваны кніжны магазін «Асвета».

А. МАРЦІНОВІЧ,
студэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна.

У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

✦ Драматычны калектыў Хойніцкага раённага Дома культуры ставіць спектакль па п'есе К. Трэнёва «Любоў Яравая».

Сваю работу самадзейныя артысты прысвячаюць 48-й гадавіне Вялікага Кастрычніка.

А. БОНДАР.

✦ Выстаўку літаратуры, прысвечаную слаўным баявым і працоўным подзвігам нашага народа за гады Савецкай улады, зрабіла Крупецкая сельская бібліятэка Добрушскага раёна.

П. СКАЧКОЎ.

✦ Амаль 200 удзельнікаў налічвае калектыў мастацкай самадзейнасці Чавускага раённага Дома культуры. Тут працуюць гурткі драматычны, танцавальны, сольнага спявання, мастацкага слова, а таксама духавы аркестр, жаночы вакальны ансамбль, агітацыйна-мастацкая брыгада.

Самадзейныя аргусты РДК часта выступаюць з канцэртамі ў калгасах і саўгасах раёна.

А. ГОЛЫШ.

УЗНАГАРОДЫ ЗА ШЭФСКУЮ РАБОТУ

Беларускія кампазітары звязаны цеснымі вузамі дружбы са слаўнымі абаронцамі свяшчэнных рубяжоў нашай Радзімы. Калектыў творчай арганізацыі вядзе пастаянную культурна-шэфскую работу сярод пагранічнікаў, часта наладжвае аўтарскія справаздачныя канцэрты на пагранічных заставах і ў баявых падраздзяленнях, дапамагае ў эстэтычным выхаванні савецкіх воінаў.

29 верасня на чарговай музычнай «серадзе» прадстаўнік Ваеннага савета войск Заходняй пагранічнай акругі ўручыў кампазітарам Я. Цікоцкаму, Г. Вагнеру і Д. Лукасу сярэбраныя медалі «За выдатную ахову дзяржаўнай граніцы СССР», а кампазітару Р. Бутвілоўскаму і музыказнаўцу А. Ракавай —граматы Ваеннага савета войск Заходняй пагранічнай акругі. Уся беларуская кампазітарская арганізацыя за вялікую культурна-шэфскую работу ў пагранічных часцях і актыўны ўдзел у камуністычным выхаванні воінаў граніцы ўзнагароджана дзвюма граматамі — Камітэта дзяржаўнай бяспекі пры Савеце Міністраў СССР і Ваеннага савета войск Заходняй пагранічнай акругі КДБ пры Савеце Міністраў СССР.

Пасля ўручэння ўзнагарод на музычнай «серадзе» адбылося праслухоўванне і абмеркаванне новых твораў беларускай музыкі—струннага квартэта А. Янчанкі, раманса М. Аладава «Роздум» і фартэпіяннага цыкла Л. Абеліёвіча «Фрэскі», які складаецца з дзевяці п'ес. У якасці выканаўцаў выступілі струнны квартэт Саюза кампазітараў БССР, саліст Беларускага радыё і тэлебачання В. Прышчапёнак і піяніст Э. Міянсараў.

У абмеркаванні новых музычных твораў прынялі ўдзел В. Сізко, А. Ладыгіна, І. Зубрыч, Г. Шарашэўскі, Л. Мухарынская, І. Губайдуліна, Я. Дзягцярык, Д. Смольскі.

Асабліва высокую ацэнку атрымаў на «серадзе» яркі па сваіх музычных вобразах, цэласны па форме праграмны фартэпіянны цыкл Л. Абеліёвіча. Усе прысутныя адзначалі, што беларуская фартэпіянная музыка папоўнілася яшчэ адным цікавым творам. Прыхільна сустрэлі калегі па працы і струнны квартэт А. Янчанкі.

У мастакоў Я. Зайцава і І. Ціханава — гарачая пара. Паводле іх эскізаў у новым дзіцячым кінатэатры Мінска ствараюцца малюнчныя вітражы і роспісы. На здымку, які зроблены нашым фотакарэспандэнтам Ул. Крукам, вы бачыце мастакоў за работай: адпюстраванне роспісу з кардону пераносіцца на сцяну.

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

Я Ў РАБОЧЫЯ ПАЙДУ — ХАЙ МЯНЕ НАВУЧАЦЬ

Раніца. Гучыць заводскі гудок, плыве над рабочым пасёлкам.

Станем ля прахадной, зірнем у твары тых, каго склікае ён.

Нетаропка і спаважна ідуць старэйшыя. І ў хадзе іх—звыклая і строгая будзённасць. А вось бязвусы хлапечы твар. Глянеш на яго —і ўражанне будзённасці адразу знікае. Як ён свеціцца! То адкрытай усмешлівай радасцю, то нецярплівай цікаўнасцю, то стоенай гордасцю, то яўна запазычанай насупленасцю броваў...

Спяшаюць у цэхі маладыя рабочыя—сыны і ўнукі ветэранаў савецкай індустрыі, нашчадкі традыцый, славы і вопыту нашага рабочага класа. Выхаваныя працоўнымі рэзервамі, яны ўмела плаваць сталь, наладжваюць станкі, выточваюць дэталі.

2 кастрычніка дзяржаўнай сістэме прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі спаўняецца 25 гадоў. Па просьбе карэспандэнта «Літаратуры і мастацтва» міністр вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР Міхаіл Васільевіч Дарашэвіч адказаў на пытанні пра падрыхтоўку кваліфікаваных рабочых кадраў, пра магчымасці юнакоў і дзяўчат атрымаць вытворчую спецыяльнасць.

— Як пабудавана сістэма дзяржаўных працоўных рэзерваў?

— Сістэма прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў нашай краіне мае багатую гісторыю, звязаную з імем Ільіча.

Грамадзянская вайна, як вядома, падарвала эканоміку краіны, паглынула яе лепшыя рабочыя кадры. Уладзімір Ільіч падпісаў дэкрэт, у якім гаварылася, што ўзняць прадукцыйнасць працы можна толькі пры ўмове шырокага распаўсюджання ў масах прафесіянальна-тэхнічных ведаў. Была ўведзена «прафесіянальна-тэхнічная павіннасць» — абавязковае навучанне ўсіх рабочых ад 18 да 40 гадоў. На прадпрыемствах адкрыліся школы фабрычна-заводскага вучнёўства.

Доўгі час школы ФЗВ рэгулярна папаўнялі рабочыя калектывы даволі кваліфікаванымі кадрамі. Але максімальна задавальняць патрэбы народнай гаспадаркі яны не маглі: занадта вузкае было кола спецыялістаў, якіх рыхтавалі гэтыя школы, ды абслугоўвалі яны толькі «сваё» прадпрыемства. Новабудоўлі ж, напрыклад, заставаліся без неабходных кадраў.

У кастрычніку 1940 года ўрад прыняў рашэнне стварыць агульнадзяржаўную сістэму працоўных рэзерваў—каб весці падрыхтоўку і размеркаванне кваліфікаваных спецыялістаў на цвёрдай планавай аснове, з улікам дзяржаўных інтарэсаў, растучых патрэб і перспектыў развіцця народнай гаспадаркі. Была створана шырокая сетка рамесных і чыгуначных вучылішчаў і школ ФЗН, якія цяпер ператвораны ў адзін тып навучальных устаноў—гарадскія і сельскія прафесіянальна-тэхнічныя вучылішчы.

У іх прымаюцца юнакі і дзяўчаты з васьмігадовай адукацыяй. Праўда, у некаторых выпадках васьмі класаў ужо малавата—напрыклад, для такіх складаных прафесій, як наладчык станкоў і машын або мантажнік радыёпрыбораў.

За 25 гадоў прафесіянальна-тэхнічныя навучальныя ўстановы краіны падрыхтавалі для народнай гаспадаркі 15,6 мільёна кваліфікаваных рабочых, з ліку якіх выйшла многа знатных людзей: 52 Героі Савецкага Саюза, 110 Герояў Сацыялістычнай Працы, 44 дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР, 34 лаўрэаты Дзяржаўных прэмій. Школу працоўных рэзерваў прайшлі Героі Савецкага Саюза Аляксандр Матросаў і Юрый Смірноў, лётчыкі-касманаўты Юрый Гагарын і Павел Паповіч.

Праслаўленымі людзьмі сталі і многія былыя выхаванцы прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў нашай рэспублікі—Героі Сацыялістычнай Працы прадзільшчыца Магілёўскага завода штучнага валакна Е. Белавусава, заслужаны будаўнік БССР А. Крэмень, механізатары В. Жалезка, І. Кулеш; дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР салігорскі шахцёр Л. Булгак, машыніст паравоза А. Шабуняеў і іншыя.

— Ці ёсць падобныя формы прафесіянальна-тэхнічнай падрыхтоўкі рабочых за мяжой?

— Такой дасканалай, вялікамаштабнай і, я сказаў бы, манеўранай сістэмы падрыхтоўкі рабочых, як наша, за мяжой, мабыць, не знойдзеш. Капіталістычныя прадпрыемствы, напрыклад, вымушаны вырашаць гэтае пытанне самастойна, паасобку. У вочы кідаецца поўная раз'яднанасць у гэтай справе, адсутнасць планавання і ўліку патрэб усёй краіны. Навучанне, як правіла, платнае. Толькі пагроза застацца беспрацоўнымі прымушае рабочых павышаць сваю кваліфікацыю. Моладзь тут не мае шырокай магчымасці атрымаць вытворчую спецыяльнасць — каштуе гэта не танна. Навучанне ж у савецкіх прафтэхвучылішчах, як вядома, бясплатнае. Выхаванцы забяспечваюцца таксама бясплатна жыллём, харчаваннем, адзеннем, падручнікамі і наглядным дапаможнікамі, а за прадукцыю, вырабленую за час навучання, атрымліваюць грашовую ўзнагароду.

За мяжой цяпер шырока ўлічваецца вопыт нашай сістэмы працоўных рэзерваў. З дапамогай Савецкага Саюза створана 37 прафесіянальна-тэхнічных цэнтраў у маладых краінах, дзе прамысловае развіццё толькі пачынаецца.

— Скажыце, як праявілі сябе працоўныя рэзервы ў часе Вялікай Айчыннай вайны?

— Гэта слаўная старонка ў гісторыі нашых працоўных рэзерваў. Навучэнцы, выпускнікі вучылішчаў паказалі сябе сапраўднымі героямі тылу. Чытачы вашай газеты павінны памятаць кнігі І. Лікстанава «Малышок», І. Васіленкі «Зорачка» і іншыя, якія расказваюць пра вялікую самаахвярнасць і мужнасць падлеткаў у форме ФЗН.

Навучэнцы выпусцілі 6 мільёнаў мін, адрамантавалі 10 тысяч паравозаў і 100 тысяч вагонаў, праклалі тысячы кіламетраў чыгуначных пуцей і ліній сувязі.

Зброю для перамогі над фашызмам кавалі таксама 11 тысяч навучэнцаў беларускіх вучылішчаў ФЗН, эвакуіраваных у тыл. А тыя, хто застаўся на занятай ворагам зямлі, змагаліся ў партызанскіх атрадах і падполлі. Мы ведаем пра бессмяротныя подзвігі адважных падпольшчыкаў, выхаванцаў працоўных рэзерваў Мікалая Кедышкі, Івана Счаснага, імем якога названа Гродзенскае ГПТВ-7.

— Якіх спецыялістаў рыхтуюць працоўныя рэзервы?

— У краіне цяпер налічваецца звыш чатырох тысяч прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў, трэцяя частка якіх—сельскія. Штогод яны рыхтуюць да мільёна рабочых па 600 прафесіях—для ўсіх галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі, будаўніцтва і сувязі, камунальнага і бытавога абслугоўвання. Сярод гэтых прафесій няма толькі тых, якія адміраюць, і тых, што патрабуюць асобай падрыхтоўкі.

У рэспубліцы дзейнічае 114 вучылішчаў, 41 з якіх — сельскія. Яны навучаюць 172 прафесіям каля 50 тысяч чалавек. З іх выходзяць металісты і будаўнікі, ткачы і апаратчыкі хімічнай прамысловасці, наладчыкі тэлевізараў і прадаўцы, трактарыстымашыністы і электраманцёры сельскай электрыфікацыі.

— Якая прафесія самая папулярная сярод моладзі?

— Цяжка вылучыць якую-небудзь адную. У горадзе—гэта прафесія будаўніка, а таксама прафесіі, звязаныя з металапрацоўкай, у сельскіх вучылішчах першае месца займае прафесія трактарыста-машыніста.

У апошні час у сувязі з развіццём радыётэхнікі ў юнакоў расце цікавасць да

РАДЗІМА — вечна жывое

З КАСТРЫЧНІКА 1965 ГОДА—70 ГАДОЎ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ СЯРГЕЯ ЯСЕНІНА

ВЯЛІКАЯ паэзія — гэта заўсёды лёс. І ўся паэзія Сяргея Ясеніна — самы падрабязны летапіс сэрца. Але Ясенін не запісваў сябе — ён мераў свет самай буйнай мерай у паэзіі — сэрцам. Вось чаму ў яго не было так званага лірычнага героя, калі часта жывуць нібы асобна «нейкая асоба» і ўласнае «я». Ён увесь—песня. І песенная сіла яго таленту ішла ад маладосці народа, які нарадзіў яго. Кожнае слова паэта—песеннае, яно пяецца само, па-руску нараспеў, шырока, адкрыта. І ці не таму, ці не ад прастораў стэпавых, ці не ад вечнага рускага прадчування новага, лепшага любіў Ясенін вясну па-блокаўску ледзь-ледзь сумна і радасна.

Імя Ясеніна ў нашай духоўнай памяці—вясеннае, яснае, маладое. Але гэта адзін Ясенін. Быў і іншы—зімні, сумны, ясны, што па-пушкінску любіў зіму, калі завея ходзіць па зямлі—лютая, кашлатая. Гэта ранняе адвечна маладое пранёс ён праз усю сваю паэзію і жыццё. З гэтага пачынаўся лёс яго паэзіі, гэта было ўнутранай асновай яго таленту.

Лёс—песня лясная, гордая і горкая! Бадай, нідзе ў свеце не было такой арганічнай, карэннай з'явы, як Сяргей Ясенін. Можа быць, Гарсія Лорка з яго «Цыганскімі рамансерамі». Але Лорка — эпічны ў паэзіі і больш пратэстуе.

Ясенінскі ж талент не так пратэстуе, як непрымірымы. Не бунт, а непрыманне, не абурэнне, а ўнутранае супраціўленне варожаму, няшчыраму — у гэтым асаблівасць яго песеннай непаўторнасці. Ясенін мякчэйшы, напеўнейшы—нездарма з кожным годам усё больш і больш вершаў яго пачынаюць спяваць.

У рэвалюцыю Ясенін прыйшоў як чалавек, можа быць, і непадрыхтаваны, але як паэт унутрана сталы.

Рэвалюцыя прынесла ў паэзію Ясеніна і ўнутраны драматызм, і эпічную аснову, таму што «Марфа Пасадніца», «Песня пра Еўпатыя Калаўрата» з'яўляюцца своеасаблівымі перакладкамі на мову паэзіі гістарычных з'яў.

Ясенін як эпік пачаўся з паэм пра Леніна і Пугачова, і тут, можа быць, упершыню ў савецкай паэзіі ён даў вобраз Леніна—чалавечнейшага чалавека.

Ясенін шукаў свайго героя, і пошукі свае пачаў з вобразаў Леніна і Пугачова—гэта вельмі характэрна! Ад Леніна да герояў барыкад 1905 года ў «Паэме пра 36»—баладзе аб непахіснай волі. Такіх герояў шукала і знаходзіла ў жыцці шчырая, магутная муза паэта.

Гэта быў «новы» Ясенін, які па-новаму абяцаў вялікія, эпічныя характары.

У паэме паэзія найбольш аб'ёмна праяўляецца як лёсазнаўства. Вось чаму ў цэнтры драматычнай паэмы Ясеніна стаіць самародны бунтарскі лёс Емяльяна Пугачова.

Час суровы вызначыў унутраны драматызм гэтых паэм. Героі—людзі вялікіх пачуццяў і непрымірымасці. Яны натуры актыўныя, яны прагнуць барацьбы. І сэнс гэтых паэм—проціборства, не як процістаянне характараў розных сутнасцю сваёй і лёсам, а як выбуховая хваля рыцараў неадкладнага дзеяння.

Як і ў сваіх лепшых вершах, Ясенін-эпік застаецца глыбока народным паэтам са сваім небывалым адчуваннем адвечнай праўдашукальніцкай рускай душы.

Пры ўсёй вонкавай супярэчлівасці і разнастайнасці Сяргей Ясенін і ў апошніх вершах, такіх, як «Капітан зямлі», «Я прыгожых такіх не бачыў...», «Персідскія матывы» і іншых, застаўся паэтам спрадвечнай яснасці і жыццялюбнасці.

Нездарма ж у 1924 годзе, запаўняючы анкету аб Пушкіне, ён піша: «Пушкін — самы любімы мною паэт. З кожным годам я ўспрымаю яго ўсё больш і больш як генія краіны, у якой я жыву».

Гэта вядомая схільнасць усіх вялікіх рускіх паэтаў да Пушкіна (прыгадаем Блока, Маякоўскага) вельмі характэрная для нашай паэзіі. Імкненне да Пушкіна — імкненне не проста да геніяльнасці. Гэта імкненне магнітнай стрэлкі да магнітнай анамаліі. Гэта імкненне вытоку да рэчышча. Пушкін навучыў рускую літаратуру слову, ён навучыў яе прастаце і праўдашукальніцтву.

І ў гэтым сэнсе «вяртанне» Ясеніна да Пушкіна было і паэтычным, і маральным крокам наперад. Творчасць Ясеніна яшчэ раз сведчыць пра тое, што руская паэзія па духу свайму і сутнасці—паэзія маладосці, паэзія прыгажосці душы чалавечай.

Суроваму, але не аскетычнаму рэалізму з яго адвечнай любоўю да жыцця—вось чаму вучыўся Ясенін у Пушкіна.

Тот, кто видел хоть однажды
Этот край и эту гладь,
Тот почти березке каждой
Ножку рад поцеловать,—

піша ён у адным са сваіх апошніх вершаў, і ў гэтых радках зноў нясцерпным, ліўневым узыходзіць сэрца паэта да самага галоўнага—да Радзімы.

Ясенін усё жыццё сваё любіў Расію. І, можа быць, ніколі яшчэ дагэтуль не прагучала гэтая тэма так шчыра, так шырока.

Успамінаючы вершы Ясеніна, міжволі адчуваеш у іх нейкую непадзельнасць, непарыўнасць тэматычную і духоўную. Яны ідуць адзін за адным—у дзівоснай гармаічнасці і неабходнасці. І здаецца, што ўся яго паэзія—адна вялікая паэма аб Расіі, так сімфанічна, так мнагамерна адчуваў ён Русь з яе гісторыяй, з яе сумленнем, з яе бярозамі, з яе справядлівым народам, які і ў зле здабывае праўду.

Вось чаму нават пейзаж у Ясеніна—не проста мілая сэрцу карціна, а песня аб раздоллі, песня аб таемным, таму што ва ўсім гэтым жыве частачка сэрца паэта. Вось чаму ў яго ў прыродзе ўсё жывое, вось чаму месяц яму здаецца жарабём, а золак — кацянём, якое мыецца. Так можа адчуваць Радзіму паэт — плоць ад плоці, кроў ад крыві, усёй памяццю сэрца ад яе. Радзіма — вечна жывое!

А для таго, каб паэт мог апець яе, патрэбна слова яснае, строгае, непераменлівае. І Сяргей Ясенін любіць гэтае слова, беражэ яго ад безаблічнасці эпігонства і ад зрэбнай старадаўнасці сялянствуючых паэтаў.

«Але ёсць гарбатыя словы, у якіх перабіты хрыбет», — піша Сяргей Ясенін, адзяляючы тым самым слоўныя выкрутасы ад сапраўдных пошукаў. І тут у адносінах да слова яўна праяўляецца зноў-такі імкненне да яснасці, да прастаты, што лішні раз сведчыць пра ўнутраную непадзельнасць, сабранасць паэта. Толькі ўсё гэта, разам узятае, вызначыла і выразнасць яго верша.

Песенная, багата напоеная фальклорам творчасць Ясеніна, нягледзячы на яўную супярэчлівасць, адзіная па думцы і адзная па слову.

Толькі маладосць народа нашага з яе энергіяй, чуллівасцю і сілаю магла нарадзіць такую арганічную, песенную па сутнасці і форме з'яву, як Ясенін.

У нашай сучаснай маладой паэзіі нямала паэтаў розных і добрых, ясенінскі напрамак кыве і развіваецца.

Для нас, маладых паэтаў, паэзія Сяргея Ясеніна перш а ўсё—частка нас саміх. Мы вучымся любіць зямлю нашу па-ясенінску, мы вучымся адчуваць слова па духу і сэнсу па-ясенінску. Не кажучы жо аб майстэрстве, не кажучы ўжо аб вопыце.

І галоўнае—мы вучымся ў Сяргея Ясеніна праўдзе.

Уладзімір ЦЫБІН,
паэт.
(АДН).

ЮБІЛЕЙНАЯ ХРОНІКА

НА ПАДШЭФНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ

Азотнатукавы завод, заводы «Электрасвятло» і «Аўтазапчастка», швейная фабрыка... Над гэтымі прадпрыемствамі шэфствуюць работнікі Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Карскага. У гэтыя дні, калі ў рэспубліцы шырока адзначаецца 70-годдзе з дня нараджэння Сяргея Ясеніна, гродзенскія бібліятэкары яшчэ раз наведалі сваіх падшэфных. Яны правялі і праводзяць гутаркі, чытаюць перад рабочымі лекцыі, наладжваюць выстаўкі, прысвечаныя жыццю і творчасці таленавітага рускага паэта.

У самой бібліятэцы — у чытальнай зале і на абанеменце — арганізаваны выстаўкі пра С. Ясеніна. Будзе праведзены і літаратурна-мастацкі вечар, прысвечаны юбілейнай даце.

З УЛАСНЫМ ЭКСЛІБРЫСАМ

Багатая бібліятэка ў выкладчыка Баранавіцкай музычнай школы Валерыя Канстанцінавіча Палікарпава. Сам ён вялікі знаўца і аматар паэзіі. Пачэснае месца на кніжных паліцах займаюць у яго і творы Сяргея Ясеніна. Ды не толькі творы паэта. Валерый Канстанцінавіч старанна збірае выразкі з газет, часопісаў, даследаванні савецкіх і зарубежных крытыкаў пра Сяргея Ясеніна. З захапленнем расказвае Палікарпаў навучэнцам у гэтыя юбілейныя дні пра свайго любімага паэта.

В. ІГНАЦЕНКА,
студэнт аддзялення журналістыкі
БДУ імя Ул. І. Леніна.

ПРАГУЧЫЦЬ КАНТАТА СВІРЫДАВА

У будучую нядзелю ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі адбудзецца музычна-літаратурны вечар, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння Сяргея Ясеніна. З чытаннем вершаў паэта выступіць лаўрэат рэспубліканскага конкурсу Рыгор Пятрэнка.

Прагучыць на вечары і кантата лаўрэата Ленінскай прэміі Г. Свірыдава «Памяці Сяргея Ясеніна». Яе выканаюць Дзяржаўны сімфанічны аркестр Беларускай ССР, Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Рыгора Шырмы, саліст Аляксандр Лук'янок.

З МАГНІТАФОННЫМ ЗАПІСАМ—НА ЗАВОД

Абедзенны перапынак. З рэпрадуктараў, устаноўленых у цэхах завода «Гомсельмаш», чуцна: «Слухайце перадачу, прысвечаную паэту Сяргею Ясеніну». Дыктар расказвае пра жыццёвы шлях і творчасць паэта. Потым у цэхах гучаць вершы Ясеніна...

Гэтую цікавую радыёперадачу падрыхтавала работніца чытальна залы Гомельскай абласной бібліятэкі імя Ул. І. Леніна Аксана Капуснікава. Я пабывала з магнітафонным запісам таксама на будзе Гомельскага суперфасфатнага завода і на іншых прадпрыемствах горада.

«ЖЫЦЦЁ Ў СТЫХІІ ВЕРШ»

Літаратурны вечар «Жыццё ў стыхіі верша» адбыўся ў бібліятэцы «Юнства» ў Мінску. З чытаннем вершаў Сяргея Ясеніна пад моладдзю выступіў артыст Рыгор Пятрэнка.

ЯК ПІСАЦЬ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ?

Дзіцячыя пісьменнікі Алесь Якімовіч, Эдзі Агняцвет, Артур Вольскі сустрэліся ў Мінскім Палацы піянераў з дырэктарамі Дамоў піянераў рэспублікі, якія знаходзяцца зараз на семінары, арганізаваным ЦК ЛКСМБ.

Паміж пісьменнікамі і выхавацелямі завязалася шчырая размова: як пісаць для дзяцей? Адчувалася, што праблемай дзіцячай літаратуры, эстэтычным выхаваннем дзяцей заклапочаны ўсе прысутныя. Дырэктары Дамоў піянераў задавалі пісьменнікам шмат пытанняў, рабілі заўвагі, выказвалі свае прапановы.

С. КАПРЭЙ.

ЗАПРАШЭННЕ НА ВЕЧАР

Цікава праводзяцца вечары распаўсюджвання кнігі ў Крупскім раёне. Звычайна да іх рыхтуюцца канцэрты мастацкай самадзейнасці, наладжваюцца гульні, танцы, атракцыёны... А ўваходны білет на такі вечар—купленая кніга. Яе вам ветліва прапануюць дзяўчаты — прадаўшчыцы з кніжнага магазіна ў Крупках Аксана Унаткіна і Тамара Іванова.

Нядаўна ў раённым цэнтры работнікі кніжнага гандлю правялі і другое цікавае мерапрыемства—«Агеньчык». За шклянкай кавы юнакі і дзяўчаты вялі размову аб новых творах літаратуры і тут жа набывалі кнігі.

Часта ў раёне наладжваюцца сустрэчы беларускіх пісьменнікаў з чытачамі. Так, у Крупках, у Абчузе, у Халопенічах пабывалі Іван Шамякін, Янка Скрыган і іншыя.

Усе гэтыя і іншыя мерапрыемствы даюць добры плён. Жнівеньскі план продажу кнігі Крупскі райспажыўсаюз выканаў на 118 працэнтаў, а васьмімесячны — на 104.

Дзяржаўны народны аркестр БССР выступае зараз у калгасах Мінскай вобласці.

На здымку — канцэрт у Слуцку. Дырыжыруе выпускнік Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Анатоль Энгельбрэхт.

Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

Сяброў кніг

Аляксей КУЛАКОЎСКІ

ПЕРШАЕ ЧАКАННЕ

«Беларусь» 1965

ГАЛОЎНЫ ГЕРОЙ — СУЧАСНІК

Сапраўднае мастацтва адрозніваецца ад танных падробак перш за ўсё тым, што яно здольнае паказаць у будзённым — незвычайнае, заўважыць у простым — гераічнае, у непрыкметным — узвышанае, што яно можа цікава, захапляюча расказаць пра самыя, здавалася б, звычайныя справы, падзеі, акалічнасці. Нярэдка ж здараецца: чытаеш твор — нібыта ўсё ў ім на месцы, «як у жыцці», але не кранае ён, не хвалюе, не ўзбагачае. Затое як радуе кніга, у якой адкрываеш штосьці новае, нязнанае раней, дзе ў знаёмым, даўно вядомым знаходзіш нейкія новыя грані, якасці, рысы!

Новая кніга А. Кулакоўскага не прэтэндуе на ўсеагульны ахоп падзей. Пісьменнік не малюе незвычайных абставін, не выводзіць надзвычайных герояў. І тым не менш яго кніга хвалюе. Ён піша нібы аб звычайным, але з гэтага звычайнага вырастае велічная карціна спраў нашых сучаснікаў.

На працягу ўжо многіх гадоў А. Кулакоўскага самым непасрэдным чынам цікавяць справы, думкі, імкненні яго землякоў — салігорцаў. І ў новай кнізе ён расказвае пра будаўнікоў Салігорскага калійнага камбіната, пра шахцёраў, працаўнікоў калгасных і саўгасных палёў.

«Першае чаканне» складаюць дзве аповесці і некалькі эцюдаў (тэрміналогія аўтара), розных па характары і кампазіцыйнай завершанасці. Адны з іх — самастойныя закончаныя апавяданні, іншыя — толькі эцюды ў поўным сэнсе гэтага слова, на адну-дзве старонкі, магчыма — загатоўкі для будучых больш разгорнутых твораў. Са старонак кнігі паўстае вялікі і прыгожы свет сучаснікаў, сціплых, працавітых, сумленных.

Вось невялічкая, на паўтары старонкі, замалёўка «Рускі цуд». Тут усяго адзін эпізод з жыцця электразваршчыка Аркадзя Сахора. За колькі часу ён, нарэшце, выбраў вольную хвіліну схадзіць усёй сям'ёй у кіно. І трэба ж іменна ў гэты час здарыцца няшчасцю — экскаватаршчык выпадкова парваў водаправодную трубу і горад можа застацца без вады. Сахор спяшаецца на месца аварыі, нават не паспеўшы пераапрануцца, і працуе, пакуль не ліквідуе аварыю.

На першы погляд здаецца — нічога тут асаблівага няма. Ды і назва знешне выглядае прэтэнцыёзнай. Але чытаем замалёўку—і насцярожанасць знікае. Для пісьменніка, безумоўна, цікавы быў не сам факт, што Сахоры ішлі глядзець кінакарціну «Рускі цуд». Для яго важна было прасачыць на будзённым жыццёвым матэрыяле пераемнасць гераічных традыцый розных пакаленняў савецкіх людзей, паказаць гераічнае і высокае ў самым звычайным. І як да месца аказваецца тут кінастужка нямецкіх сяброў! Сахор «працаваў увесь вечар і ноч, пакуль не пайшла ў горад вада.

Прыйшоў дадому ў пяць гадзін раніцы. Жонка не спала.

— Ну, як «Рускі цуд»? — спытаў Аркадзь у яе.

Жанчына глянула на новы касцюм, які быў падобны на самую горшую парусіну, і шчыра сказала:

— Харошы фільм. Праўдзівы».

«Рускі цуд» працягваецца, — сцвярджае пісьменнік.

А. Кулакоўскі не прыдумвае сабе герояў. Ён расказвае пра тых, з кім рос, вучыўся, сябраваў, басаногі бегаў дзіцячымі і юнацкімі сцежкамі. І гэты расказ адначасова становіцца расказам пра велічныя старонкі нашай рэчаіснасці. Вось перад намі дэпутат Вярхоўнага Савета БССР Л. А. Булгак («Доля міліметра»). Яго маленькі пакой-кабінет ніколі не пустуе. Да яго ідуць і з радасцю і з бядою. Па яго прапанове ўнесена важнае ўдасканаленне ў канструкцыю горнага камбайна, у выніку чаго значна павялічылася здабыча калійнай солі. Новы чалавек, наш сучаснік — так і хочацца назваць гэтага шахцёра...

Па душэўных якасцях вельмі блізкі да Булгака і стары Міканор Шарыдода з аповесці «Тры зоркі». Міканор — былы партызан, пасля воін Савецкай Арміі. На фронце ён страціў нагу, але і хвіліны не можа сядзець без справы. Была ў яго любімая работа, якая стала амаль прафесіяй, — класці стагі. «Калі Міканор завершваў стог сена, то кожны ведаў: стаяцьме гэты стог хоць некалькі год... З каторага боку ні глянь — царква, а не стог». За гэта яго нават узнагародзілі мянушкай — Таптун. Цяпер, без нагі, на стог не падняцца, ён — начны вартаўнік і апрача таго амаль штодзень выходзіць на саўгасны нарад. Калі Міканору кідаюць папрок, што ён працуе за нізкую плату, стары з пачуццём уласнай годнасці адказвае: «А я магу і без платы! — і тлумачыць: — Дзяржава мне пенсію дае, трохі зарабляю ўдзень, а ноччу магу і прайсціся. Што ж тут такога? Ён абураецца любой несправядлівасцю, да ўсяго яму клопат — і за пакрыўджанае дзіця заступіцца, і скажа праўду ў вочы свайму суседу, нячыстаму на руку Тхорыку, і ўмяшаецца ў справы саўгаснай свінафермы.

Найбольш раскрываецца высакароднасць Міканорав душы ў клопатах пра Юзіка Вішнеўскага, паралізаванага ад перанесенай кантузіі. Міканор падтрымлівае яго цёплым спагадлівым словам, усюды хадайнічае, дабіваецца, каб Юзіку арганізавалі сапраўднае лячэнне. «Адказнасць мае чалавек, і душа ў яго баліць за сваю справу», — гаворыць пра Міканора дырэктар саўгаса.

З добрым спагадлівым гумарам расказвае пісьменнік пра лайдакаватага, але бяскрыўднага Нічыпара. Затое пра бюракратаў, злодзеяў піша са злой іроніяй. У аповесці многа трапных назіранняў, дакладных дэталей. Так, мы не сустракаемся з Тхорыкавым сынам, але ўжо адна дэталь дае аб ім поўнае ўяўленне: ён трымае сабаку для начальніка шахты, які «ахвочы пахадзіць са стрэльбаю»...

Кніга багатая на вобразы добрых людзей, шчырых і сціплых працаўнікоў. Прычым аўтар не гаворыць пра іх высокія і гучныя словы, ён логікай мастацкіх вобразаў сцвярджае высакароднасць іх душ. Гэта і настаўнік, што дапамагае не вельмі спрактыкаваным падарожнікам рамантаваць аўтамашыну, хоць дома яго чакае хворая дачка. Гэта і безыменны рабочы, што дзеліцца апошнімі яблыкамі з незнаёмым яму хлопцам. Гэта чулая і спагадлівая, хоць знешне суровая Макатрыха. Вось глядзіце, нібы кажа пісьменнік, якія цудоўныя людзі навокал — шчодрыя, душэўныя, бескарыслівыя.

У кнізе многа святла: яна ўся прасякнута прыўзнятым лірычным настроем. Шмат празрыстасці, цеплыні ў апавяданнях «Усюды вада», «Кавалёва лаза», даволі тонка перададзены пачуцці закаханай дзяўчыны ў апавяданні «Макшэйдэр».

Услаўляючы сённяшнюю мірную працу, пісьменнік не забывае, у якім цяжкім змаганні з фашызмам было здабыта права на яе. Напамінам аб мінулым гучаць эцюды «Гуляеўцы», «Нейкія хлопчыкі», «Бацькава вуліца», «Блакада».

Да трагічных і велічных дзён вайны вяртае нас аповесць «Твой шлях перад табою». Тут моцна гучыць тэма інтэрнацыянальнай дружбы. Пісьменнік узяў прыватны факт і на яго аснове паказаў еднасць славянскіх народаў у барацьбе з фашызмам.

У аповесці праўдзіва паказана атмасфера партызанскага жыцця. З любоўю намаляваны вобраз маладога савецкага камуніста Людвіка. Цікава намечаны і вобраз маладой падпольшчыцы Жэні. Запамінаецца сцэна, калі Жэня чакае Людвіка, каб адвесці яго да партызан. Але далей чамусьці вобраз дзяўчыны падаецца без асаблівай глыбіні, даволі бледна. Магчыма, гэта таму, што аўтар спадзяецца вярнуцца да яе ў новым творы — такое абяцанне ў аповесці ёсць...

Хочацца зрабіць і яшчэ некалькі заўваг. Не ўсё ў кнізе задавальняе ў адноўкавай меры. Дзе-нідзе адчуваецца налёт саладжавасці, асобныя героі недастаткова паказаны ў дзеянні. Занадта кідаецца ў вочы зададзеная фрагментарнасць апошняй аповесці. Усё гэта — крыўдныя хібы ў цікавай кнізе, якая радуе глыбінёй думкі, паэтычнай свежасцю, гнуткай выразнай мовай. Кніга падаравала нам нямала прыемных сустрэч з нашымі сучаснікамі — працавітымі, шчырымі людзьмі.

Г. ЮРЧАНКА.

Чалавеку гаварыць — дзякуй

СЛОВА ПРА ЗЕМЛЯКА

Чалавек будучага камуністычнага веку... Калі я думаю пра яго, я заўсёды бачу перад вачыма свайго земляка і блізкага знаёмага Паўла Іванавіча Пруднікава — сціплага вясковага настаўніка, сельскага інтэлігента.

Я не прысутнічаў на ўроках Паўла Іванавіча, не ведаю, як выкладае ён літаратуру, але, калі назіраю, як вясёлым натоўпам ідуць у бібліятэку дзеці, як радасна наладжваюць яны літаратурныя вечары і як бойка спрачаюцца на дыспутах у клубе, я думаю: у гэтай дружбе моладзі з літаратурай — заслуга Паўла Іванавіча. Сам ён горача любіць літаратуру, піша і друкуе ў мясцовай газеце вершы, нарысы. Многія яго аднавяскоўцы памятаюць і могуць працытаваць вершы настаўніка, выдадзеныя да вайны асобным зборнікам «Песні грузчыка» пад псеўданімам—Паўлюк Буравей.

Пасля заняткаў настаўнік звычайна ідзе да людзей на фермы, у майстэрні, брыгады. Яго рады бачыць усюды. Павел Іванавіч ведае самыя цікавыя навіны, падзеі, можа завесці гутарку на любую тэму. Кожны такі прыход настаўніка ўзнімае ў людзей працоўны настрой.

Павел Іванавіч не толькі ўмелы агітатар. Ён энтузіяст паляпшэння вясковага быту, добраўпарадкавання сяла, азелянення вуліц. Нядаўна яго выбралі старшынёй вулічнага камітэта.

Аднавяскоўцы ведаюць пра чулую, добразычлівую душу Паўла Іванавіча. Калі ў каго здарыцца якое гора, непрыемнасць ці ўзнікне патрэба ў чужой парадзе, ён звычайна ідзе да настаўніка: той паможа. І сапраўды, Павел Іванавіч параіць, падкажа, а то і сам, калі трэба, пойдзе з просьбай за каго-небудзь у органы мясцовай улады.

Вось за ўсё гэта паважаюць Паўла Іванавіча Пруднікава аднавяскоўцы.

В. БРЫЛЕВІЧ,
селькор.

Вёска Слабодка
Браслаўскага раёна.

Архіўныя знаходкі

«ЧУЖЫХ ДУМАК НЕ ПЕРАКАЗВАЎ...»

Адам Антонавіч Бабарэка (1899—1938) належыць да таго пакалення беларускіх пісьменнікаў, жыццёвы шлях якіх вызначыла Кастрычніцкая рэвалюцыя, якія сталі на самым пачатку дарог беларускай савецкай літаратуры.

Мне ўжо даводзілася пісаць пра гэтага пісьменніка і літаратурнага крытыка, аднаго з заснавальнікаў і кіраўнікоў літаратурна-мастацкіх згуртаванняў «Маладняк» і «Узвышша». Нядаўна я пазнаёміўся з малавядомымі артыкуламі пісьменніка, а таксама з яго асабістым архівам, які захоўваецца ў Маскве ў яго жонкі Ганны Іванаўны і дачкі Алесі Адамаўны. Шмат у іх не толькі цікавага, а і каштоўнага для разумення літаратурнага жыцця 20—30-х гадоў на Беларусі.

Сваё эстэтычнае крэда А. Бабарэка найбольш поўна выказвае ў артыкуле «За культуру мастацтва», які быў надрукаваны ў часопісе «Чырвоны сейбіт» (1926, № 1). «Беларускім сялянам і рабочым,—пісаў ён,—патрэбна мастацтва. І гэта мастацтва павінна быць вышэйшым ад таго, якое ёсць у буржуазіі. А для таго, каб стварыць такое мастацтва, трэба ведаць, што ёсць, трэба навука і навука вялікая. Трэба апанаваць культурнае мастацтва».

З неапублікаваных матэрыялаў крытыка найбольшую цікавасць маюць артыкулы «Паэзія як выяўленне. (Некаторыя думкі аб пралетарскай школе паэзіі)», «Супраць ветру. (Хто такі Я. Пушча?)» і чарнавы накід артыкула пра паэму Ул. Дубоўкі.

У першым артыкуле А. Бабарэка спрабаваў вырашыць пытанне сутнасці творчага працэсу ў мастацтве. У 20-я гады, ды і пазней, мастацкую творчасць нярэдка разумелі толькі як «форму ідэалогіі», пры чым з гэтага разумення выпадала спецыфіка адносін мастака да рэчаіснасці. Адам Бабарэка, як і «Узвышша» наогул, рабіў спробу пераадолець гэты недахоп. Ён увёў у эстэтыку паняцце мастацкай практыкі і аналізаваў спецыфіку гэтай практыкі. А. Бабарэка не забываў і класавай сутнасці мастацтва. «Гісторыя сцвярджае, што кожная сацыяльная група мае сваё разуменне мастацтва»,—пісаў ён. Пры гэтым класавасць мастацтва, на яго думку, не супярэчыць пераемнасці ў яго развіцці. Гэтае развіццё ажыццяўляецца праз «адмаўленне адмаўлення», г. зн. праз выкарыстанне каштоўнасцей мінулага для цяперашняга. Адначасова крытык паставіў пытанне аб неабходнасці тэаратычнай распрацоўкі праблем метаду, напрамку і стылю савецкай літаратуры. У гэтым, бясспрэчна, яго заслуга. Але ён памыляўся, калі лічыў і рамантызм, і рэалізм «буржуазнымі школамі паэзіі». Недаацэнка рэалістычных традыцый мінулага выявілася, між іншым, у спробе абгрунтаваць так званы «акцэнтызм» ці інакш «канструктыўны напрамак у пралетарскай паэзіі».

Калі выйшла з друку паэма Уладзіміра Дубоўкі «І пурпуровых ветразяў узвівы...», то вульгарызатары накінуліся на яе, займаючыся, па сутнасці, не літаратурнай крытыкай, а палітычнай дыскрэдытацыяй паэта. І толькі Бабарэка дае высокую ацэнку паэмы, якая, на яго думку, сведчыла аб ідэйна-эстэтычнай сталасці маладой беларускай савецкай паэзіі. У гэтай паэме Дубоўка асудзіў вульгарызатарскі падыход да мастацтва, выступіў за высокую мастацкую культуру, за выкарыстанне мастацкай спадчыны мінулага і вусна-паэтычнай творчасці ў першую чаргу. Вастрыё сатыры паэта было накіравана супраць бюракратаў, бесприпыніповых кар'ерыстаў і спрашчэнцаў ад літаратуры...

У канцы 20-х гадоў паэт Язэп Пушча вельмі хваравіта рэагаваў на некаторыя адмоўныя з'явы грамадска-палітычнага жыцця, у сувязі з гэтым у яго з'явілася некалькі ўпадніцкіх вершаў. Замест аб'ектыўнага аналізу творчасці паэта крытыкі А. Сянкевіч, Т. Глыбоцкі, Л. Бэндэ і некаторыя іншыя пачалі бессаромнае цкаванне Язэпа Пушчы. У гэтых умовах патрэбна была грамадзянская мужнасць, каб выступіць у абарону паэта. Яна была ў Адама Бабарэкі. У артыкуле «Супраць ветру» ён выступае ў абарону Я. Пушчы.

Невыпадкова Якуб Колас, як паведамляе Максім Лужанін, высока ставіў Адама Бабарэку як крытыка, адзначаючы, што ён «чужых думак не пераказваў, свае меў».

У асабістым архіве А. Бабарэкі ёсць таксама планы новых прац па эстэтыцы і тэорыі літаратуры.

Жыццевы і літаратурны шлях Адама Бабарэкі абарваўся рана. Але і тое, што ён паспеў зрабіць, пазнана стэць прадметам аб'ектыўнай ацэнкі савецкай грамадскасці. Думаю, што наспела неабходнасць выдаць кніжку яго выбраных твораў.

Ул. КОНАН,
кандыдат філасофскіх навук.

спецыяльнасцей радыёмантажніка, рэгуліроўшчыка радыёапаратуры, наладчыка тэлевізараў. Дзяўчаты ж з большай ахвотай вучацца на швачак.

Як правіла, колькасць заяў у прафтэхвучылішчы штогод перавышае ўстаноўлены кантынгент.

— А як з паліграфістамі?

— Я не ўспомніў пра іх, бо гэта не самая масавая прафесія. У рэспубліцы ёсць адно паліграфічнае вучылішча — Мінскае ГПТВ-32. Яно поўнасцю забяспечвае паліграфічную прамысловасць рэспублікі неабходнымі кадрамі. Установа выпускае спецыялістаў сямі прафесій: друкара, лінатыпіста, наборшчыка ручнога набору, фатографа, пераплётчыка, фотакарэспандэнта і прадаўца кніг...

— Прадаўца кніг!

— Так, спецыяліста кніжнага гандлю, які шырока арыентуецца ў літаратуры і мае якасці сапраўднага прапагандыста кнігі, а не толькі навыкі культурнага абслугоўвання.

Заўважу, што вучылішча паліграфістаў—адно з самых узорных у рэспубліцы. Кожны пяты навучэнец—ударнік рэзерву брыгад камуністычнай працы. Маладыя паліграфісты самі друкуюць орган працоўных рэзерваў—газету «Рабочае юнацтва», што з'яўляецца для іх добрай практыкай.

— Здаўна наша краіна славілася народнымі ўмельцамі—разбярамі па дрэву, металу, косці і іншымі. Ці рыхтуюць вучылішчы паслядоўнікаў гэтых выдатных майстроў, ці навучаюць яны гэтым «унікальным» прафесіям?

— Пытанне гэтае важнае, але як мае быць не вырашанае. Праўда, асобныя вучылішчы ў Расійскай Федэрацыі навучаюць «унікальным» прафесіям — каменячоса, майстра машыннай вышыўкі, спецыяліста мастацкай апрацоўкі—невялікія групы моладзі. У падрыхтоўцы іх удзельнічаюць і таленавітыя патомныя майстры.

У нас у рэспубліцы сталяроў-чырванадрэўшчыкаў, майстроў мастацкай разьбы па дрэву, аддзелачнікаў мэблі, маляроў-мастакоў, майстроў інкрустацыі выпускае Бабруйскае мастацкае ГПТВ-15.

Неабходна смялей прыцягваць у вучылішча таленавітых умельцаў, дабівацца, каб кожны з іх меў вучняў і перадаваў ім свае «сакрэты».

— У якіх спецыялістах народная гаспадарка рэспублікі будзе мець у бліжэйшыя гады найбольшую патрэбу?

— Трэба больш рыхтаваць спецыялістаў радыётэхнікі і хіміі. За апошнія гады выпуск рабочых-хімікаў павялічыўся ў пяць разоў, а патрэбы ў іх усё не меншаюць. Для новабудоўляў хіміі цяпер рыхтуецца звыш дзвюх тысяч спецыялістаў—лабарантаў, апаратчыкаў, слесараў кантрольна-вымяральных прыбораў і інш.

Свае пазіцыі прад'яўляе працоўным рэзервам на галіна беларускай прамысловасці—надабывальная.

У сувязі пашырэннем у бліжэйшыя гады сферы тавога і камунальнага абслугоўвання трэбяцца новыя тысячы прадаўцоў, праў, краўцоў, спецыялістаў па хімчыстцы цырульнікаў, наладчыкаў тэлевізараў.

Нягледзячы аднак, на вялікія маштабы падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў, яны значальняюць патрэбы народнай гаспадаркі іны пакуль што толькі на 20 працэнтаў.

— Ці сяброўць выхаванцы працоўных рэзерваў з літаратурай і мастацтвам, з эстэтыкай?

— Я чакаю ад вас гэтага пытання. На яго ёсць што адказаць. Мы клапоцімся, каб будучыя рабочыя былі не толькі майстрамі сваёй справы, але і рознабакова адукаванымі, высокакультурнымі, свядомымі людзьмі. Для гэтага вучэбную праграму нядаўна ўведзены курсы «Грамадазнаўства» і «Эстэтычнага выхавання». Падлеткі вывучаюць літаратуры мастацтва, знаёмяцца з творамі выдатных савецкіх і зарубежных пісьменнікаў, такой, кампазітараў. У навучальных усіх створаны калектывы мастацкай самадзейнасці, студыі выяўленчага мастацтва, тэхнічнай творчасці, маладзёжныя клубы накі і дзяўчаты наведваюць шматлікіх універсітэты культуры.

Духоўнае развіццё спалучаецца з фізічным выхаваннем яго не захапляе бадзёрая, спартыўная моладзь працоўных рэзервы на парадах і святочных стадыёнах! Армія спартыўнага таварыства «Працоўныя рэзервы» налічвае звыш мільёна юнакоў і дзяўчат, сярод якіх сотні чэмпіёнаў рэспублікі, краіны і свету. 10 кастрычніка вы будзеце мець прыемнасць бачыць на стадыёне ў Мінску спартыўныя выступленні навучэнцаў беларускіх прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў—у гонар 25-годдзя працоўных рэзерваў.

— А ўвогуле як будзе адзначацца юбілей!

— Толькі што падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва навучэнцаў да юбілею. Напярэдадні ва ўстановах прайшлі дні працоўных традыцый, дні дружбы з воінамі, вечары мастацтва, спорту, сустрэч з былымі выпускнікамі вучылішчаў. Праведзены ўсесаюзны нядзельнік працоўных рэзерваў. У Мінску адкрыта выстаўка тэхнічнай творчасці навучэнцаў вучылішчаў. Моладзь рыхтуецца да ўсесаюзнай радыёперакліччі пакаленняў рабочага класа. У сталіцы мае адбыцца рэспубліканскі вечар, прысвечаны юбілею. 25-годдзе працоўных рэзерваў—сапраўды ўсенароднае свята...

Калі больш пытанняў у вас няма, скажу вось яшчэ што. Самае галоўнае для нас цяпер—выхаванне змены, вартай нашага рабочага класа. Змены, якая б высока ўзняла сцяг камуністычнай свядомасці сваіх бацькоў, ганарылася б сваёй прафесіяй, сваімі рабочымі рукамі, сваёй вялікай і пачэснай місіяй—будаваць камунізм. Працоўныя

ПАДАРОЖЖА Ў ЦУДОЎНЫ СВЕТ

Побач з кінематографам і тэлебачаннем у нашы дні ўсё большае значэнне набываюць так званыя выстаўкі новага тыпу. Калі ў задачы звычайнай экспазіцыі ўваходзяць азнаямленне гледачоў з мастацтвам мастака або расказ пра работу творчага калектыву, дык цяпер падобныя выстаўкі твораў мастацтва або рэчаў усё часцей замяняюцца выстаўкамі ідэй, у якіх асобныя жывапісныя творы або экспанаты адыгрываюць тую ж ролю, што кубікі ў мазаіцы ці мазкі ў карціне мастака, не больш. У гэтай выстаўцы рэчы падпарадкаваны адзінай думцы і служаць адной, агульнай мэце. Слова «выстаўка» мала пасуе да такога роду відовішча, аднак з-за адсутнасці іншага давядзецца карыстацца гэтым.

Рыхтуецца адкрыццё ў Маскве першай Усесаюзнай выстаўкі цацак — генеральны агляд вялікага цацачнага свету, творчая справаздача цэлай армії майстроў-цацачнікаў. Яна будзе адкрыта ў бліжэйшыя месяцы.

У задачу выстаўкі ўваходзіць не столькі прадэманстраваць усе наяўныя цацкі, колькі раскрыць іх ролю ў фарміраванні чалавека будучыні, яго грамадзянскага, этычнага, маральнага і фізічнага аблічча.

Камісіі, якія будуць тут працаваць, адбяруць усё лепшае, установяць тыраж і забаронять застарэлыя ўзоры, якія не адпавядаюць патрабаванням сённяшняга дня. Мэтаю дзелавога раздзела выстаўкі з'яўляецца паляпшэнне якасці і асартыменту дзіцячых цацак.

Вы трапляеце ў краіну, якая называецца «Дзяцінства», у цудоўны свет вечных адкрыццяў, нечаканых і радасных прыгод. Тут дамы, вуліцы, машыны, параходы, намаляваныя дзецьмі і павялічаныя ў шмат разоў мастакамі. З неба на вас глядзіць жоўтае сонца — сланечнік, а ў садах растуць чырвоныя яблыкі і сіні вінаград. У дамах жывуць лялькі.

Цацка — гэта сучасны свет, змадэліраваны для дзяцей. Яна далучае дзіця да свету дарослых, да пачатковых працоўных дзеянняў, яна памагае пазнаць навакольнае жыццё і вучыць яго будаваць.

Вось канструктары ї мадэлі суднаў, самыя разнастайныя машыны, зборныя цацкі, слясарнае і сталярнае начынне, тут ёсць касмадром і касмічныя караблі, атамны ледакол і ракеты — з усім гэтым дзіця знаёміцца ўжо змалку. Яно вучыцца збіраць дэталі машын, будаваць дамы і параходы — пакуль гэта толькі гульня.

У свеце навукі ў гіганцкіх крышталічных рашотках і прасторавых хімічных структурах выстаўлены аптычныя дзіцячыя прыборы — мікраскопы, фільмаскопы і калейдаскопы, тут мноства гульняў, з дапамогаю якіх набываюцца першыя пазнанні гісторыі, геаграфіі, фізікі і астраноміі. Свет навукі пачынаецца таксама з гульні. І першая творчасць таксама прыходзіць у дзяцінстве. Хіба ёсць такія дзеці, якія б не малявалі і не ляпілі, не вырэзалі фігурак з паперы і не майстравалі б ёлачных цацак?

А потым на машыне Часу вы робіце цікавае падарожжа ў мінулае. Вы бачыце цацкі, у якія гулялі шмат гадоў назад. Лялькі з дрэва і тканіны, саломы і гліны, стракатыя свістулькі дымкаўскіх майстрых, залаціста-жоўтыя каталкі і канькі сямёнаўскіх умельцаў, лакавыя мерынаўскія матрошкі і яркі з тонкім роспісам па золаце посуд Хахломы. Цацкі народаў Усходу і Каўказа, Поўначы і цэнтральных абласцей Расіі... Кожная мае сваю спецыфіку, кожная зроблена ў традыцыях і звычаях народа, які яна прадстаўляе.

Чаго толькі не ўбачыш на гэтай выстаўцы! І, вядома ж, гэта не выстаўка, а хутчэй своеасаблівы тэатральны паказ з фабулаю і сюжэтам, які адрозніваецца ад звычайнага тым, што тут глядач сам арганізоўвае свой прагляд і змену ўражанняў.

Але для такіх паказаў спатрэбілася і драматургія. Для работы над сцэнарыем відовішча прыцягнены прафесіянальныя пісьменнікі. Сяргей Міхалкоў — вядомы дзіцячы пісьменнік, член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук РСФСР і Барыс Бродскі — тэарэтык савецкага афармлення мастацтва, журналіст і пісьменнік, які шмат піша для дзяцей. Над стварэннем выстаўкі працуе вялікі калектыў мастакоў, педагогаў, урачоў, інжынераў, акцёраў.

Галіна БЕЛЬСКАЯ.
(АДН).

Стаяць дні цёплыя, ціхія... Фотаэцюд Ул. КРУКА.

ЯРАСЛАЎЛЬ — КІНАЗДЫМАЧНАЯ ПЛЯЦОЎКА

Расказ пра тое, як ствараюцца магутныя рухавікі, як ідзе барацьба за павелічэнне мотарэсурсу, пра людзей прадпрыемства — пра гэта будзе фільм.

Яраслаўскае лета гэтага года прайшло пад знакам інтэнсіўнай работы кіназдымачных груп. Саяцілі юпітэры ў кабінеце мэра горада, «Уключыць маторы!» — гучала ў цішыні царквы Ільі Пророка — непаўторным помніку старажытнага дойлідства. «Пазіравала» аператарам і прыгажуня Волга...

Яраслаўль прыцягнуў да сябе ўвагу адразу трох напрамкаў вялікага кінематографа. Здымаліся два мастацкія фільмы. Адзін з іх «Жанчыны». Гэтае апавяданне пра вялікую чалавечую дабрату паставіў рэжысёр Павел Любімаў. Над цікавай камедыяй пра незвычайныя прыгоды жыхара маленькага горада Івана Сяргеевіча Траўкіна працавала ў Яраслаўлі і Растове-Яраслаўскім творчая група студыі «Масфільм».

Ленінградскую студыю навукова - папулярных фільмаў зацікавіў Яраслаўскі маторны завод. Расказ пра тое, як ствараюцца магутныя рухавікі, як ідзе барацьба за павелічэнне мотарэсурсу, пра людзей прадпрыемства — пра гэта будзе фільм.

Вельмі арыгінальная работа аператара Ленінградскай кінахронікі Аркадзя Рэйзентула. Ён вырашыў паказаць горад, разнастайнасць яго жыцця праз аднаго чалавека — старшыню выканкома гарадскога Савета. Гэты фільм, зняты па заказе АДН, так і называецца — «Мэр горада».

Стракаталі кіназдымачныя апараты і ля помнікаў старажытнарускага дойлідства, якімі так багаты Яраслаўль. Іх «атакавалі» фінскія кінематаграфісты Раймо Лескенен і Раймо Вяйсянен, кінааматары яраслаўскай студыі «Чайка» і кінахроніка з Ленінграда.

Па заказе амерыканскай радыё- і тэлевізійнай карпарацыі «СІ-БІ-Эс» ішлі здымкі фрагментаў для вялікага каляровага гукавога дакументальнага фільма «Волга» — вялікая рака свету».

Альберт ТРАФІМАЎ.
(АДН).

ТЭАТР МАЛАДЫХ

Да гэтай пары ў вядомага эстонскага рэжысёра, артыста і педагога Вальдэмара Пансо не было свайго тэатра. З яго спектаклямі, заўсёды цікавымі і папулярнымі, гледачы сустракаліся на розных сцэнічных пляцоўках. У оперным тэатры «Эстонія» ў пастаноўцы Вальдэмара Пансо з поспехам ідзе «Мая цудоўная лэдзі», у драмтэатры — «Чалавек і бог» А. Тамсаарэ, у рускім тэатры «Венская паштовая марка» А. Лійвеса. Няма ў Эстоніі тэатра, дзе б не выступалі выхаванцы Вальдэмара Пансо.

Некалькі гадоў у Таліне працуе кафедра сцэнічнага мастацтва, якая ўзначальваецца нястомным рэжысёрам.

І сёлета рэжысёр дамогся стварэння ў Эстоніі прафесіянальнага тэатра юных. 20 сёлетніх выпускнікоў склалі трупу новага тэатра. На першы збор прыйшлі не толькі маладыя акцёры, але і вядомыя майстры сцэны: Антс Лаутэр, Ційю Рандвійр, Валянцін Архіпенка і пісьменнік Юхан Смуул. Усе яны радасна віталі нараджэнне новага талінскага тэатра для моладзі — пятага прафесіянальнага тэатра эстонскай сталіцы. Вальдэмар Пансо сказаў:

— У талінскага юнацтва да гэтага часу не было свайго тэатра. Мы пастараемся, каб наш тэатр стаў сапраўдным сябрам і тых, каму сёння 14, і тых, каму сёння 25. Спектаклі, якія мы маем намер іграць, будуць звернуты да нашых дзён, думак і спраў моладзі.

Першы сезон Талінскі тэатр юнага гледача пачаў вялікім гастрольным турнэ па Эстоніі.

Павел ЛУГАЎСКОЙ.
(АДН).

Помнікі нашага краю

КАМЯНЕЦКАЯ ВЕЖА

СЕМСОТ гадоў! Столькі прайшло часу з тых дзён, калі была пабудавана Камянецкая вежа, якая стала выдатным помнікам старажытна-рускага фартыфікацыйнага дойлідства.

Гісторыя збудавання вежы такая. У 1276 годзе Валынскі князь Уладзімір Васільевіч, каб надзейна абараніць Барасцейскую зямлю, вырашыў пабудаваць новы горад з крэпасцю ў ім. З гэтай мэтаю князь загадаў аднаму са сваіх ваеначальнікаў — Алексе выбраць выгадны стратэгічны пункт. Такое месца было хутка знойдзена сярод лясоў пры зліцці рэк Лясной і Белай, за 35 кіламетраў на паўночны ўсход ад цяперашняга Брэста.

Князь Уладзімір ухваліў месца, загадаў высекчы лес, закласці новы горад, назваўшы яго — Камянец.

Вежа, пасля яе пабудовы, была выбелена вапнаю і стала называцца ў народзе Белай. Адсюль, магчыма, атрымала назву і Белавежская пушча, якая некалі падыходзіла да самага горада. У старажытных дакументах пушча называлася Белавежска-Камянецкай.

Вежа прызначалася для абароны. Гэта і вызначала яе архітэктурнае аблічча. Яна цыліндрычнай формы, увенчана крапаснымі зубцамі, сцены яе выкладзены з асабліва моцнай чырвонай цэглы. Вышыня вежы каля 33 метраў, дыяметр — 13,5, таўшчыня кладкі — 2,5 метра. Вядома, тыя, хто некалі абараняўся, маглі адчуваць сябе ў поўнай бяспецы.

Вежа мае адзіныя дзверы. У сярэдзіне пяць паверхаў, злучаных дубовымі лесвіцамі. Пад вежаю былі некалі вялікія сутарэнні, адкуль, па паданню, вялі падземныя хады да рэк Лясной і Белай.

Архітэктура Камянецкай вежы не магла быць іншай. Вежа — вартавы. Гэта воін, старажытнарускі волат. Расправіўшы свае магутныя плечы, ён стаў на рубяжы роднай зямлі, пільна ахоўваючы яе спакой і свабоду. Вось чаму будаўнікі вежы вырашылі яе ў строгіх, спакойных архітэктурных формах. Яна не мае архітэктурных аздабленняў, пазбаўлена дэкаратыўных упрыгожванняў. Яе паверхня толькі на рознай вышыні ажыўлена рознымі па памерах вокнамі-амбразурамі. Адзіным упрыгожваннем вежы з'яўляецца карніз, выкладзены фігурнай кладкай праз рад «на вугал».

У лаканізме і выразнасці ліній, у суразмернасці асобных частак ёсць пэўная велічнасць і прыгажосць — строгая, мужная.

Хто будаваў вежу? Яе будаўніком з'яўляецца той жа Алекса, які быў не толькі выдатным ваеначальнікам, але і цудоўным «градарубам». Воін і будаўнік. Глыбокі сэнс закладзены ў гэтых словах. Здаўна рускі чалавек вымушаны быў будаваць сваю дзяржаву і ахоўваць яе ад ворагаў.

Камянецкая вежа — найцікавейшы помнік старажытнасці — добра захавалася.

Цяпер у ёй арганізаван музей.

І. ЭЛЕНТУХ,
старшы архітэктар па ахове помнікаў Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах будаўніцтва і архітэктуры.



Вось яна, Камянецкая вежа.

Філарманічны календар

Філарманічны настрычнік пачынаюць нашы госці з Украіны. У канцэртнай зале сёння адбудзецца выступленне Кіеўскага камернага аркестра пад кіраўніцтвам лаўрэата Міжнароднага конкурсу Антона Шароева. Малады калектыў выканае творы Баха, Гендэля, Вівальдзі, Моцарта, Карэлі, Самарціні, Шастаковіча, Бартана і украінскіх кампазітараў Штагарэнкі і Скорыка.

Тры дні ў нас будзе выступаць Маскоўскі эстрадны аркестр Цэнтральнага Дома культуры чыгуначнікаў пад кіраўніцтвам Дзмітрыя Пакраса.

Аматараў музыкі мы запрашаем 3 кастрычніка на лекцыю-канцэрт «Франц Шуберт». Лекцыю чытае член Саюза кампазітараў музыказнаўца Л. Аўэрбах. У канцэрце прымуць удзел заслужаная артыстка БССР Е. Эфрон (фартэпіяна), Л. Ілюковіч (сапрана), Л. Шубіна (мецца-сапрана), Д. Зубрыч (барытон) і квартэт філармоніі ў складзе М. Браценінава, Г. Клачко, П. Кірыльчанкі і Б. Сиабло. У праграме — квартэт рэмінор, фартэпіянныя п'есы і песні. (Пачатак канцэрта ў 14 гадзін).

У гэты ж дзень філармонія наладжвае літаратурна-музычны канцэрт, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння Сяргея Ясеніна. З чытаннем вершаў паэта выступіць лаўрэат Усесаюзнага конкурсу чытальнікаў Рыгор Пятрэнка. Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР і Дзяржаўная харавая капэла БССР выканаюць сімфанічную паэму Г. Свірыдава «Сяргей Ясенін». (Пачатак канцэрта ў 18 гадзін).

Упершыню ў Мінск прыязджае заслужаны артыст Эстонскай ССР Хуга Лепнурм (арган). Х. Лепнурм пасля заканчэння кансерваторыі два гады вучыўся ў вядомага парыжскага арганіста Марселя Дзюпрэ. З 1934 года ён выступае з сольнымі канцэртамі ў Эстоніі і за яе межамі (Фінляндыя, Швецыя, Чэхаславакія). Х. Лепнурм — аўтар песень, кантат, арганнага і фартэпіянных канцэртаў, камерна-інструментальных твораў. У час канцэрта 5 кастрычніка ён выканае Тры «цієнтас» Кабанілеса, Прэлюдыю і Фугу невядомага кампазітара паўночнанямецкай школы XVII стагоддзя, Дзве харальныя прэлюдыі Прэлюдыю і Фугу ля-мінор Баха, творы Карындзі, Франка, Месіяна, Эбена.

6 кастрычніка ў філармоніі канцэрт па абанеменце № 3, прысвечаным творчасці П. І. Чайкоўскага. Дзяржаўным сімфанічным аркестрам БССР будзе дырыжыраваць заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР А. Стасевіч, піяніст — М. Дзік. У праграме — «Франчэска да Рыміні», Канцэрт № 1 для фартэпіяна з аркестрам і Чацвёртая сімфонія Чайкоўскага.

Радыёслухачы добра ведаюць эстрадны аркестр пад кіраўніцтвам Барыса Райскага. На эстрадзе аркестр паяўляецца радзей. 7 і 8 кастрычніка філармонія наладжвае канцэрты, у якіх разам з аркестрам выступяць вядучыя майстры беларускай эстрады.

Абанементны канцэрт, прысвечаны творчасці Бетховена, адбудзецца ў нас 9 кастрычніка.

Шэсць дзён, пачынаючы з 9 кастрычніка, будуць праходзіць у Мінску выступленні брыгады артыстаў «Ленканцэрта» з удзелам Жана Татляна. Канцэрты папулярнага эстраднага спевака, абвешчаныя ў вераснёўскім календары, своечасова не маглі адбыцца. Разам з Жанам Татлянам выступаюць джаз-ансамбль пад кіраўніцтвам Аляксандра Кублінскага і канферансье Уладзімір Шадрын.

Два канцэрты, 14 і 15 кастрычніка, дасць у нас скрыпач з ГДР Густаў Шмаль. Артыст выканае Санату ля-мінор Бетховена, Санату рэ-мінор Брамса, рапсодыю «Цыганка» Равеля, Санату для скрыпкі Хіндэміта і тры фрагменты з сюіты «Рамео і Джульета» Пракофьева.

15 кастрычніка ў канцэртнай зале філармоніі — урачыстае адкрыццё Дзён культуры ГДР. Адбудзецца вялікі вечар. У наступны дзень Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР дасць канцэрт з твораў нямецкіх кампазітараў. Салістам выступіць італьянскі піяніст Радольфа Капаралі. 17 кастрычніка Р. Капаралі дае сольны канцэрт. У праграме — дзве санаты Скарлаці, Саната фа-мажор Чымароза, Таката і Фуга рэ-мінор Баха — Бузоні, Саната № 18 мі-бемольмажор Бетховена, «Порт Трыяна» Альбеніса і творы Шапена.

Чатыры дні ў філармоніі будзе выступаць Аркестр танцавальнай музыкі пад кіраўніцтвам Фіпса Фляйшара (ГДР).

18 кастрычніка ў Мінску пачынаюцца гастролі Ансамбля песні і танца Народна-вызваленчай арміі Кітая. Выступленні гэтага калектыву (у складзе яго 185 удзельнікаў) будуць праходзіць на сцэне акруговага Дома афіцэраў.

Канцэрт, прысвечаны творчасці нямецкіх кампазітараў-арганістаў, дасць у філармоніі 20 кастрычніка беларускі арганіст, дыпламант першага Міжнароднага конкурсу ў Лейпцыгу Алег Ячанка.

Пяць дзён, з 20 да 24 кастрычніка, на нашай сцэне будзе выступаць папулярная выканаўца эстрадных песень рына Брнэўская.

У выхадзелю днём 24 кастрычніка адбудзецца канцэртна дзіцячым абанеменце.

26 кастрычніка філармонія наладжвае другі вечар, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння Сяргея Ясеніна. З кампазіцыяй па творах паэта выступіць чытальнік Сяргей Саналовуў.

І апошнія дні месяца адбудуцца выступленні эстраднага аркестра Літоўскай ССР. 30 кастрычніка дасць канцэрт у Мінску славуты армянскі выканаўчы калектыў — квартэт імя Камітаса. Кастрычнік завершыць канцэрт Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР для слухачоў абанемента.

А. КАРДЫМОН,
дырэктар-распараджальнік канцэртнай залы філармоніі.

КАСТРЫЧНІК

Нашы госці (злева направа): скрыпач Густаў Шмаль, піяніст Радольф Капаралі, спевакі Ірына Брнэўская і Жан Татлян.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ за рубяжом

ПАДАРУНАК ПРЫХІЛЬНІКАМ ДЗІКЕНСА

Лондан рыхтуе падарунак для ўсіх прыхільнікаў Дзікенса. Як бы ні было прыемна прыхільнікам яго таленту самім чытаць раманы гэтага пісьменніка, няма сумнення, што яго творы робяць куды большае ўражанне, калі іх чытае ўголас чалавек, які любіць і разумее Дзікенса. А калі ён да таго ж добры акцёр, дык уражанне ствараецца незабыўнае.

Іменна такую асалоду атрымліваюць цяпер англічане ў тэатры «Глоб» у Лондане, дзе ў выкананні акцёра Эмліна Уільямса адкрылася серыя Дзікенсаўскіх чытанняў. 15 гадоў назад, чытаючы біяграфію Дзікенса, Уільямс звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што сам пісьменнік ахвотна выступаў з публічным чытаннем урыўкаў са сваіх твораў. Уільямс успомніў, што некалі яго спробы перарабіць творы Дзікенса для тэатра не ўдаліся іменна з прычыны таго, што месцы з найбольшым драматычным напружаннем у Дзікенса напісаны ў апавядальнай форме, а таму іх нельга перарабіць у дыялог. Але чаму б не выкарыстаць драматычныя магчымасці апавядальнай прозы Дзікенса на сцэне, як рабіў гэта сам вялікі пісьменнік?

У 1952 годзе, прачытаўшы ўсе творы Дзікенса і вывучыўшы напамяць большасць з іх, Уільямс упершыню выступіў на лонданскай сцэне ў Дзікенсаўскіх чытаннях. Яго праграма мела вялікі поспех. У праграму сёлетняга сезона Дзікенсаўскіх чытанняў у Лондане ўваходзяць урыўкі з раманаў «Наш агульны сябар», «Домбі і сын», «Малышка Дорыт», «Аповесць пра два гарады» і іншых.

Уільямс выступае на сцэне загрыміраваны пад Дзікенса. Сцэна прыбрана амаль таксама, як, напэўна, яна была прыбрана, калі сам Дзікенс выступаў з чытаннем урыўкаў са сваіх раманаў 100 гадоў назад. Акцёр стаіць за кафедрай, што з'яўляецца дакладнай копіяй кафедры, якою карыстаўся ў свой час Дзікенс (арыгінал знаходзіцца ў Музеі дзікенсаўскіх раліквій у Лондане). Ствараецца поўная ілюзія, што перад вамі сам вялікі пісьменнік чытае свае творы.

Аднак было б няправільна наважаць выступленне Уільямса «чытаннем», хоць на кафедры перад ім ляжаць кнігі, і перад тым, як перайсці да чарговага ўрыўка, Уільямс знаходзіць адпаведнае месца ў тым ці іншым томе твораў Дзікенса. Яму ніколі не даводзіцца апускаць вочы ў кнігу — усю праграму ён ведае напамяць. Акцёр пераносіць слухачоў у чароўны свет, населены персанажамі Дзікенса, і ствараецца ўражанне, што ты чуеш іх галасы.

Пэт ГРЭГАРЫ,
карэспандэнт ТАСС.

Лондан.

ПІВАВАРЫ-МЕЛАМАНЫ

У Злучаных Штатах людзі п'юць піва самых розных марак. Мноства гатункаў піва выпускаецца ў Мілуокі (штат Вісканскін), у прыватнасці, піва маркі «Шлітц». Рэкламныя заклікі, угаворваючы аматараў піва аддаць перавагу іменна гэтай марцы, сцвярджаюць: «Шлітц» — гэта піва, якое праславіла Мілуокі». Праўда, у апошні час аўтары рэкламных аб'яў піваварнай кампаніі, якая выпускае «Шлітц», дадаюць, што гэта піва праслаўляе не толькі горад, але і... музыку.

З тэксту аб'яў можна пачарпнуць дакладныя звесткі аб тым, колькі дзесяткаў тысяч ньюёркцаў наведала канцэрты, якія даюцца на адкрытым паветры сімфанічным аркестрам Нью-йоркскай філармоніі. Канцэрты праходзяць у «Сентрал-парку, а таксама ў велізарных парках Брукліна і Куінса. Аўтары аб'яў падкрэсліваюць, што гэтыя канцэрты па памеры аўдыторыі пабілі ў Нью-Йорку ўсе рэкорды (у адным толькі «Сентрал-парку» колькасць слухачоў склала 143 тысячы чалавек).

А якое дачыненне мае да ўсяго гэтага «Шлітц»?

У рэкламнай аб'яве ёсць «сціплы» адказ на зададзенае пытанне: іменна кампанія «Шлітц» плаціць за ўсе выдаткі, звязаныя з наладжваннем канцэртаў на адкрытым паветры, якія аматары музыкі могуць наведваць зусім бясплатна. Піваары сцвярджаюць, што гэтыя канцэрты «ўвойдуць у гісторыю музыкі», і ў поўнай адпаведнасці з традыцыямі «Мэдзісан авеню» (рэкламная імперыя ЗША) дадаюць: «У канчатковым выніку, «Шлітц» і філармонія — гэта дзве рэчы з усяго найлепшага, што можа прапанаваць Амерыка».

Праўда, трэба аддаць піваварам належнае: яны яшчэ не дайшлі да таго, каб параўноўваць «вартасці» сваёй прадукцыі з творамі Брамса, Бетховена, Чайкоўскага і Моцарта, якія выконваюцца аркестрам філармоніі ў час гэтых канцэртаў пад зоркамі. Аднак, як кажуць, цяжкі толькі пачатак.

Саша ЛУРЫ,
карэспандэнт ТАСС.

Нью-Йорк.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

1 кастрычніка

Першая праграма. 12.00 — тэлевізійныя навіны (М). 12.15 — для вучняў другой змены. «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для старэйшых школьнікаў. «Ці ведаеце вы гісторыю?» Адказы на пытанні першага тура алімпіяды (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — для дзяцей. Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб. «Кібернетыка і шахматы». 18.50 — музычны антракт. 19.00 — М. Пагодзін. «Блакітная рапсодыя». Спектакль Маскоўскага акадэмічнага тэатра імя Ул. Маякоўскага (М). У перапынках — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «Здароўе». Тэлевізійны часопіс. 23.00 — «Лірычны настрой». Канцэрт.

Другая праграма. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — «Экнамісты за круглым сталом» (М). 19.00 — героі нашага часу. «Пакаленні служаць людзям». «Сейнеры уходзяць за гарызонт». Кінанарысы. 19.40 — «Ведзьма». Фільм-опера па апавяданню А. П. Чэхава. 20.25 — «Без віны вінаватыя». Мастацкі фільм. 22.00 — па вашых просьбах. Канцэрт (М).

2 кастрычніка

Першая праграма. 11.00 — «Без віны вінаватыя». Мастацкі фільм. 15.20 — праграма перадач. 15.25 — «Дружба не ведае адлегласцей». Дакументальны фільм. 15.45 — «Дагуляліся». «Жабяня шукае бацьку». Зборнік мультыплікацыйных фільмаў. 16.05 — «Плытагоны». Тэлевізійная навела. 16.30 — тэлевізійныя навіны. 17.00 — футбол. «Дынамо» (Кіеў) — «Дынамо» (Мінск). 18.45 — «У эфіры «Маладосць». Да 45-годдзя прамовы Ул. І. Леніна на III з'ездзе камсамола (М). 19.15 — «Прапоўным разервам — 25 год». Канцэрт. Перадача з Палаца з'ездаў (М). 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — вечар эстраднай музыкі. Канцэрт эстраднага аркестра Ленінградскага радыё і тэлебачання. Перадача з Ленінграда.

Другая праграма. 15.30 — для школьнікаў. «Прыгоды Арцёмкі». Мастацкі фільм (М). 16.50 — канцэрт татарскай музыкі. Перадача з Казані (М). 17.20 — «Ключ да дзвярэй у космас». Рэпартаж з ВДНГ (М). 17.50 — тэлевізійныя навіны (М). 18.00 — канцэрт. 18.40 — наш кінаглобус. «Дарогі пятага кантынента». Кінанарыс. 19.30 — «На бойкім месцы». Фільм-спектакль. Дзецям да 16 год глядзець не дазваляецца.

3 кастрычніка

Першая праграма. 10.00 — «Скарбы Траццякоўскай галерэі». Народны мастак СССР П. Д. Корын (М). 10.30 — для дзяцей. «Будзільнік» (М). 11.00 — «Вялікае сэрца». Кароткаметражны фільм. 11.30 — для дзяцей. «Як самому зрабіць цацкі». 12.20 — «Горад цудаў». Перадача з ВДНГ (М). 15.30 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Пра доблесць, пра подзвіг» (М). 16.00 — музычны кіёск (М). 16.30 — «Здароўе» (М). 17.10 — тэлевізійныя навіны (М). 17.20 — «Святло і цені». Міжнародная праграма (М). 17.50 — «Ключ да неба». Мастацкі фільм. 19.05 — оперныя спевакі. Галіна Вішнеўская. 19.50 — тэлевізійнае акно сатыры (М). 20.00 — чэмпіянат СССР па хакею. ЦСКА — «Спартак». Перадача з Лужнікоў. 20.30 — «Кінаэкран — 1965». Перадача з Тбілісі (М). 21.15 — тэлевізійныя навіны (М). 21.45 — «У эфіры — «Маладосць». «Гарызонт». Перадача з Ленінграда.

Другая праграма. 11.00 — для школьнікаў. «Ці ведаеце вы гісторыю?» Адказы на пытанні першага тура (паўтор) (М). 17.50 — канцэрт Дзяржаўнага рускага народнага аркестра імя Осіпава (М). Тэлевізійнае акно сатыры (М). 18.20 — вясёлы экран. «Гарачыя дзянькі». Мастацкі фільм (М). 19.30 — «Навіны дня». Кіначасопіс (М). 19.40 — «Чайка рускай сцэны». Перадача пра В. Ф. Камісаржэўскую. 20.50 — «Сірэна». Канцэрт артыстаў Польшчы.

АПАВЯДАННІ ПРА САВЕЦКІХ ЛЮДЗЕЙ

ЗДАРЫЛАСЯ НА ЗАСТАВЕ

Гісторыя гэтая адбылася на пагранічнай заставе, закінутай у лясной глушы. Доўгі час называлі яе «заставай халасцякоў». Так павялося ўжо, што траплялі на яе, як правіла, нежанатыя афіцэры і старшыны. Прыязджаў з вучылішча ў часць малады афіцэр, а на лясной заставе была вакансія, яго без затрымкі і адпраўлялі туды.

Праўда, афіцэры падоўгу там не былі. Паслужыць малады лейтэнант год-паўтара, з'ездзіць у адпачынак, ажэніцца, глядзіш, і перабіраецца на іншую заставу.

На гэты раз правіла было парушана. Камандаванне прыслала на лясную заставу сямейнага афіцэра. Разам з новым начальнікам капітанам Яршовым прыехалі яго жонка Лідзія Міхайлаўна і пяцігадовая дачушка Наташка.

Застава сустрэла іх гасцінна. Гаваркая, ласкавая Наташа палюбілася ўсім. Яе прысутнасць прыносіла салдатам многа вясёлых хвілін. Кожны вечар перад баявым разлікам, калі не здаралася нічога непрадбачанага, пагранічнікі збіраліся ў летняй альтанцы. Была там абавязкова і іх любімица. Яна выходзіла ў кола і «на поўным сур'ёзе» галаском, як званочак, абвяшчала:

— Залаз выступіць алтыстка Наташа Ялшова. У яе лепелтуалы песні. Яшчэ яна і станцуе...

Наташа ведала шмат песень, пачутых па радыё. У яе была выдатная памяць, і яна хутка, як кажуць, на ляту, запамінала новыя мелодыі.

— Наташа, праспявай «Бірусінку»!

— Пра Волгу, Наташачка, «Издалека долго».

— «Пусть всегда будет солнце!» Просім, — чулася з усіх канцоў.

Доўга прасіць Наташу не даводзілася. Яна і спявала і танцавала ўсё, што прасілі. Асабліва падабалася салдатам тое, як яна капіравала манеры эстрадных артыстаў: заломлівала рукі, трэсла галавой, усміхалася.

Іншы раз дзяўчынка прыводзіла на свае канцэрты маму. Лідзія Міхайлаўна прыходзіла са скрыпкай і нотамі. Тады больш выступалі салдаты. Яны спявалі рускія і ўкраінскія песні або незвычайна прыцішліыя, нібы зачараваныя, слухалі п'есы Моцарта, Чайкоўскага, Шапена, Паганіні.

Наташу ўсе любілі і песцілі. Кожны, хто вяртаўся з водпуску, абавязкова вёз ёй падарунак. Таму што фантазія працавала ў адным напрамку, дык дарылі пераважна лялек. Карацей кажучы, праз паўгода ў Наташы было чатыры Тані, тры Ніны, дзве Каці і восем лялышак. Праўда, салдат Сімакоў адступіўся ад агульнай традыцыі і замест лялькі прывёз вялікую мадэль самазвала. Сімакоў — шафёр, і па яго глыбокім перакананні, лепшага падарунка для дзіцяці прыдумаць нельга...

У пачатку лета здарылася бяда. Лета сёлета запазнілася: занадта зацягнулася вясна. Пасапраўднаму прыгрэла сонца толькі ў сярэдзіне чэрвеня. Выдаўся цудоўны дзень. Наташа бегала ля заставы па палянцы, якая патанала ў кветках. Кожная палячка ў гэтых месцах — стракаты і пышны дыван, сатканы з мноства палявых кветак самых дзівосных колераў. Рамонкі, макі, адуванчыкі, званочкі, браткі, фіялкі... Усё гэта гарыць на сонцы, пераліваецца, ад усяго ідзе дзіўны, востры водар, ад якога кружыцца галава.

Бегаючы ад кветкі да кветкі, дзяўчынка адышлася далёка ў лес і заблудзілася. Агледзеліся, што яе няма гадзіны праз дзве, а то і тры. На пошукі, апрача бацькоў, пайшло некалькі салдат. Ужо вечарэла, а пошукі не мелі вынікаў. Тады ўзнялі ўсю заставу. Уласна, узнімаць людзей не трэба было, усе вольныя ад службы пайшлі без каманды. Абмацалі кожны кусцік, агледзелі лясныя ямы, пускалі ракеты, хорам крычалі: «На-та-ша! Ау-у!». Прашукалі ўсю ноч. Але Наташа не адгукалася. Не памог і Байкал — вопытная вышукная аўчарка.

Толькі на другі дзень, калі людзі літаральна валіліся з ног, дзяўчынка знайшлася. Кіламетраў за пяць ад заставы ля невялікага ручайка, прыкрытага густымі зараснікамі вербалозу, яе напаткаў Сімакоў. Аказалася, што Наташа захацела піць, спусцілася да ручая, а падняцца назад не здолела. Там і прасядзела амаль суткі на камені. Яна чула, як яе клікалі, бачыла ракеты, клікала маму і тату, плакала, але голас яе патанаў у зараснікаў і шуме шпаркага ручая. Сімакоў знайшоў яе соннай.

Усё, здавалася, абышлося шчасліва. Аднак радасць была заўчасная. Наташа моцна прастыла і захварэла. Дзяўчынка кідалася ў гарачцы, траціла прытомнасць. Урач маёр Сяргей Крапівін, які прыехаў па тэрміновым выкліку, канстатаваў двухбаковае запаленне лёгкіх.

Прыціхла застава. Салдаты асабліва востра адчулі, які дарагі ім гэты маленькі чалавек. Змрачнейшы за ўсіх быў Сімакоў. Ён хадзіў сам не свой, стаў маўклівы, нібы хварэла яго ўласная дачка, хоць у яго не было нікога. Ён страціў бацькоў у час вайны, на другім годзе жыцця, і выхоўваўся ў дзіцячым доме. У гэтага здаравяка было чулае, ласкавае сэрца. А дзеці хутка знаходзяць такіх людзей і хіляцца да іх. Разгледзела гэта ў дзядзьку Сіме і Наташа і, магчыма, трошачкі больш, чым да іншых салдат, прывязалася да яго.

Калі Сімакоў даведаўся, што доктар, зрабіўшы ўколы хворай, збіраецца ад'язджаць, ён устрывожаны прыбег да камсамольскага сакратара Віктара Голубева:

— Камсорг, затрымай доктара. Прыдумай што-небудзь!..

— Ну, што я прыдумаю?..

— Ідзі прасі, хай ў палітаддзел. Ну, дзейнічай, ліха на яе!

— Бескарысна прасіць. У яго хворыя ў стацыянары. Не мока ён іх пакінуць на волю лёсу.

— А Наташку можна?..

Сабраліся ўсёчлены бюро. Віктар сказаў:

— Ёсць прапанова прыняць такое рашэнне і запісаць у пратакол экстранага пасяджэння бюро:

«Слухалі: Інфармацыю камсамольца тав. Сімакова аб хваробе дачкі начальніка заставы Н. Яршовай пяці гадоў.

Пастанавілі: Ад імя камсамольцаў заставы прасіць доктар маёра Сяргея Герасімавіча Крапівіна не з'язджаць да поўнага ачуняння названай Н. Яршовай».

Доктар ужо збіраўся ў дарогу і сумеўся, атрымаўшы такі дакумент. Пачаў званіць у атрад. Растлумачыў, што адбылося і, нарэшце, выйшаў да пранічнікаў:

— Застаюся. Выратана. Угаварылі. У стацыянары падажурыць начальнік.

Хвароба затягнулася, і доктару давялося пражыць на лясной досыць доўга. У гэтыя дні на заставе не было чуваць ні шуму, ні смеху. Мацней за ўсё бераглі салдаты спакой сваёй любіцы. Акалі хто забываўся, таму моўчкі паказвалі некалькі важкіх кулакоў.

Уставалі клаліся салдаты з адзіным пытаннем: «Як Наташка?». Паколькі ўсім ня